

## Грып на парозе

СТАР. 4

Сямейная газета



## Дзіцячы садок мары



## Сын «падымае руку»...

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 227 (28337)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Дзісенскі Дом рамёстваў Мёрскага раёна займаецца рэканструкцыяй традыцыйнага строю, у які мясцовыя прыгажуні прыбіраліся ў пачатку мінулага стагоддзя. Над праектам па адраджэнні народнага ўбору працуюць дырэктар установы Алена БАЛАШ разам з майстрамі Людмілай ГАНЕБНАЙ і Яўгеніяй КОЗЕЛ.**

# ПАЎНОЧНЫЯ ЎБОРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Культура ў «лічбе»

## КАЛІ ЭКСКУРСАВОД — СМАРТФОН

### Мабільны дадатак дазваляе віртуальна прагуляцца па Брэсцкай крэпасці

**Сёння, каб пабываць у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», неабавязкова ехаць на легендарную брэсцкую зямлю. Бясспрэчна, гераічную цытадэль мусіць наведаць кожны нашчадак пакалення пераможцаў, але адпаведныя магчымасці ёсць не ва ўсіх. Праўда, і тым, хто там ужо пабываў, часам хочацца вярнуцца, бо, як заўсёды, то недагледзеў, то недачуў, то не ўсё зразумеў...**

Брэсцкая крэпасць па-ранейшаму з'яўляецца адным з самых папулярных аб'ектаў у жыхароў і гасцей Беларусі. Цяпер стала магчымым апынуцца там у любы час, знаходзячыся ў любым месцы краіны. Спампаваўшы (прычым бясплатна!) на свой гаджэт мабільны дадатак «Брэсцкая крэпасць. Схаваная гісторыя», у рэжыме «афлайн» можна пазнаёміцца з гісторыяй 60 аб'ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі комплексу, убачыць звыш 200 архіўных і сучасных фотаздымкаў, а таксама самастойна павандраваць па малавядомай частцы крэпасці.

СТАР. 4




■ Здаровае харчаванне

## ЗАМЕСТ ВІНАГРАДУ І ПЕРСІКАЎ — БУРАКІ І ЦЫБУЛЯ

### Лепш ужываць тое, што расце на сваёй зямлі

**Недахоп энергіі, якая атрымліваецца з ежай, дэфіцыт спажыўных рэчываў і мікраэлементаў, у тым ліку жалеза, ёду і вітаміну А, а таксама хуткі рост колькасці людзей з лішняй вагой — галоўныя сусветныя праблемы ў дакладах экспертаў апошняй сесіі Камітэта па сусветнай харчовай бяспецы. У ідэале любая краіна павінна імкнуцца да таго, каб у кожнага чалавека пастаянна быў фізічны, сацыяльны, эканамічны доступ да дастатковай колькасці бяспечнай і спажыўнай ежы, якая задаволіць харчовыя патрэбы, смакавыя перавагі, дазволіць падтрымліваць актыўны і здаровы лад жыцця.**

Паводле слоў **загадчыцы сектара харчовай бяспекі Інстытута сістэмных даследаванняў у аграпрамысловым комплексе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдата эканамічных навук Святланы КАНДРАЦЕНКІ**, наша краіна адносіцца да катэгорыі краін з вельмі нізкай, менш за 5 працэнтаў, удзельнай вагой насельніцтва, якое недаядае, — нароўні з краінамі ЕС і Паўночнай Амерыкай. (У рэйтынгу The Economist Intelligence Unit Беларусь займае 46-е месца з 113 дзяржаў.) У Беларусі ўзровень разнастайнасці рацыёну харчавання ацэньваецца ў 75 са 100 балаў, дастатковасць харчавання на ўнутраным рынку — у 81 бал, развіццё сельскагаспадарчай інфраструктуры — у 42. Сярод нашых слабых бакоў — высокі ўзровень расходаў на харчаванне, недастатковы ўзровень дзяржаўных расходаў на сельскагаспадарчыя даследаванні і распрацоўкі, адсутнасць апублікаванай нацыянальнай стратэгіі павышэння якасці харчавання.

За кошт уласнай вытворчасці мы задавальняем патрэбы ўнутранага рынку ў малацэ і малочных прадуктах на 220 працэнтаў, мясе і мясных прадуктах — на 134, яйках — на 129, цукры і алеі — на 180 і 120 працэнтаў адпаведна. Разам з тым доля некаторых імпартных прадуктаў на спажывецкім рынку застаецца неабгрунтавана высокай. Беларусы спажываюць да 90 працэнтаў імпартных фруктаў, гародніны — 26, рыбы — 53, фруктовых сокаў і сокаў з гародніны — 28, алею — 76, дзіцячага харчавання — 33 працэнты.

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН:**

*«Сёння ад моладзі чакаюць крэатыўных ідэй і прынцыпова новых рашэнняў актуальных задач прыкладнога характару. У найбліжэйшай і аддаленай перспектыве неабходны ўмовы па фарміраванні ў маладых вучоных даследчых навыкаў. Тут галоўнае — не страціць талент, аказаць дапамогу найбольш перспектыўнай моладзі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9514 | ▲ |
| Еўра | 2,0720 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0762 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Ва ўрадзе

# МАШЫНАБУДАВАННЮ ПАТРЭБНЫ СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

## Такую перспектыву яго развіцця бачыць прэм'ер-міністр

**На чарговым пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмяркоўвалася работа айчынных прадпрыемстваў машынабудавання.**

Па словах **прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА**, гэтая галіна прамысловасці ў першую чаргу мае велізарны чалавечы патэнцыял. «Толькі на машынабудаўнічых прадпрыемствах Мінпрама працуе больш за 160 тысяч чалавек. Пры гэтым адно працоўнае месца ў машынабудаванні забяспечвае стварэнне ў іншых галінах ад 7 да 12. У выніку атрымліваецца, што машынабудаўнічыя холдынгі Мінпрама забяспечваюць заказы больш за 370 арганізацый рэспублікі (дзяржаўных і прыватных), на якіх працуе больш за 327 тысяч чалавек», — падкрэсліў старшыня Кабінета міністраў.

Па выніках працы за студзень-верасень 2016 года ў цэлым па міністэрстве выраблена прамысловай прадукцыі на суму 6,3 мільярда рублёў. Аб'ём паставак на экспарт склаў 2,4 мільярда долараў, паведамляе прэс-служба Саўміна. «Сёння машынабудаўнічым прадпрыемствам даводзіцца працаваць у вельмі складаных эканамічных умовах. Гэта зніжэнне попыту на сусветных рынках і, як вынік, зніжэнне коштаў на прадукцыю, дэфіцыт абаротных сродкаў, складанасці з фінансаваннем», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што па меры магчымасці вядучым машынабудаўнічым арганізацыям — «МАЗ», «БелАЗ», «БМЗ», «МТЗ», «Гомсельмашу», холдынгу «Аўтакампаненты» — у 2015—2016 гадах аказвалася пэўная дзяржпадтрымка, што дазволіла захаваць вытворчасці і іх рытмічную працу. «Разам з тым для забеспячэння далейшага ўстойлівага развіцця нашага машынабудавання і вызначэння перспектыў у гэтым напрамку патрабуецца сістэмны падыход», — падкрэсліў старшыня Саўміна.

Акрамя таго, прэм'ер нагадаў пра задачы, якія былі пастаўлены перад Міністэрствам прамысловасці ў дапрацоўцы праекта стратэгіі развіцця беларускага машынабудавання на 2016—2030 гады. У прыватнасці, гаворка ішла аб крыніцах фінансавання, удасканаленні сістэмы кіравання, зніжэнні выдаткаў, а таксама аб больш шырокім удзеле ў машынабудаванні малога і сярэдняга бізнесу.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# БІЗНЕС: АД ГАНДЛЮ ДА ВЫТВОРЧАСЦІ

**У Віцебску зарэгістраваныя каля 9 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, каля 3,5 тысячы суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Апошніх — больш за трэць ад усіх у Віцебскай вобласці. Карэспандэнт «Звязды» папрасіў намесніка старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта Зінаіду КАРАЛЁВУ расказаць, наколькі эфектыўна працуе недзяржаўны сектар эканомікі.**



***— Ці ўсяляюць вынікі працы бізнесу аптымізм?***

— Нядаўна на пасяджэнні выканкама была агучана адпаведная статыстыка за 9 месяцаў. Вось толькі некалькі лічбаў. Удзел малога бізнесу ў тавараабароце на ўзроўні 20%. Радуе, што толькі каля 30% — у сферы гандлю. А калісьці, вы ж, напэўна, памятаеце, пераважная колькасць дзелавых людзей зарабляла менавіта на перапродажы тавараў.

Наогул прыемна, што з кожным годам павялічваецца актыўнасць у вытворчасці і сферы паслуг. На сёння ад недзяржаўнага сектара эканомікі — каля 10% — будаўнічыя паслугі, 6% — транспартныя. Сярод прыватных вытворчых прадпрыемстваў ёсць і ўнікальныя, напрыклад, пад'ёмнікі з Віцебска экспартуюцца ў розныя краіны. Вядомая за мяжой і фірма, якая можа спраектаваць, зрабіць і ўсталяваць «пад ключ» комплексы па ачыстцы вады. Ёсць і іншыя прыклады.

Наконт напаўнення казны горада: 15—17% паступленняў у кансалідаваны бюджэт склалі падаткі ад плацельшчыкаў недзяржаўнай формы ўласнасці.

***— У Віцебску не першы год пры падтрымцы гарвыканкама праходзяць бізнес-форумы. Зразумела, што гэта спрыяе развіццю дзелавой ініцыятывы. А чым яшчэ мясцовая ўлада дапамагае прадпрымальнікам?***

— Мы падтрымліваем ідэі прадпрымальнікаў і словам, і справамі. Гатовы супрацоўнічаць па любых кірунках. Падказваем, дзе арандаваць памяшканне, спрыяем заключэнню інвестыцыйных дагавораў, па-добраму лабіруем інавацыі.

Пры гарвыканкаме створаны спецыяльны савет па падтрымцы прадпрымальніцтва. Сярод яго членаў разам з дзяржаўнымі служачымі ёсць і прадстаўнікі бізнесу. Савет абмяркоўвае розныя пытанні, праблемы, імкнецца разам знайсці спосабы і шляхі іх вырашэння.

***— Зінаіда Аляксандраўна, ці ёсць у Віцебску добрыя прыклады прыватна-дзяржаўнага партнёрства?***

— У Віцебску разам з прыватным бізнесам актыўна рэалізуюцца праекты па развіцці магазінаў «крокавай даступнасці». У прыватнасці, горад супрацоўнічае з гандлёвай фірмай «Веста» (віцебскі першапраходзец бізнесу ў сферы гандлю. — **А.П.**).

Спрыяем будаўніцтву аўтамыек па прынцыпе самаабслугоўвання. Адна з іх на вуліцы Ленінградскай. Яна працуе круглыя суткі. Раней там было балота, а цяпер, дзякуючы дзелавой ініцыятыве, можна не толькі памыць машыну, але і зрабіць рамонт, наведаць кафэ, адпачыць. Мы ўдзячныя тым, хто рэалізаваў гэту цікавую ідэю. І надалей будзем падтрымліваць усе добрыя пачынанні.

У прыватна-дзяржаўнага супрацоўніцтва добрыя перспектывы. Такое партнёрства павінна развівацца. Яно спрыяе вырашэнню многіх задач. Напрыклад, па стварэнні новых рабочых месцаў. Каля 40% занятых у нас — у недзяржаўным сектары эканомікі, у тым ліку ў малым і сярэднім бізнесе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Чулі?!

# ВІНТАКРЫЛАЯ «ХУТКАЯ ДАПАМОГА»

**На тэрыторыях буйных бальніц Мінскай вобласці з'явяцца пляцоўкі для верталётаў.**

Ужо пачаліся работы па будаўніцтве першай такой пляцоўкі пры Мінскай абласной клінічнай бальніцы. «Паркоўка для верталёта» дазволіць нашмат хутчэй дастаўляць цяжкахворых і пацярпелых у аварыях для аказання экстраннай медыцынскай дапамогі. «Будаўніцтва такіх пляцовак — патрабаванне Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі Беларусі», — растлумачыў на XX сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Сяргей ТРУСАЎ**.

**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ** нагадаў пра тое, што ў праекце кардыяхірургічнага цэнтра пры Мінскай абласной клінічнай бальніцы, які разглядаўся некалькі гадоў таму, верталётная пляцоўка павінна была размяшчацца на даху цэнтра. Такое суседства дазволіла б сэканоміць 15—20 хвілін першай гадзіны ў экстранных сітуацыях, каб мінімізаваць рызыку інфаркту, інваліднасці, смерці ў людзей, якія знаходзяцца ў крытычным стане.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# ПЛЮС 10 ДЗЁН БЕЗ ПЕНІ

**Да завяршэння пераходу на адзіную сістэму «Разлік-ЖКП» (да новага года) урад устанавіў нулявыя пені за несвоечасовую плату за камунальныя паслугі.**

Пра гэта паведаміў першы **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алег ПАСКРОБКА**. Ён адзначыў, што з аплатай «камуналкі» за кастрычнік у многіх жыхароў краіны і сапраўды з'явіліся пэўныя праблемы. Узніклі тэхнічныя збоі па аплаце гэтых паслуг праз інфакіёскі, а часам жыроўкі пачалі прыходзіць з пэўным спазненнем. Менавіта ў гэтых выпадках прымяненне санкцый за няўплату вырашылі перанесці на 10 дзён.

Намеснік міністра лічыць, што гэта рашэнне павінна абараніць правы і законныя інтарэсы спажыўцоў у перыяд завяршэння работ па ўкараненні адзінай агульнарэспубліканскай інфармацыйнай сістэмы па ўліку, разліку і налічэнні платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылым памяшканнем. У прынятым дакуменце гаворыцца, што цяпер пеню не трэба будзе плаціць у тым выпадку, калі людзі па ўважлівых прычынах «несвоечасова і (або) не ў поўным аб'ёме ўнеслі плату за «камуналку», карыстанне жылым памяшканнем дзяржаўнага жыллёвага фонду або электраэнергію, спажытую на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання, у тым ліку ліфтаў, у шматкватэрных жылых дамах».

Між іншым, амністыя за неўплату будзе дзейнічаць толькі пэўныя перыяды. Пры атрыманні жыровак за верасень гранічны тэрмін аплаты (без пені) працягваўся з 26 кастрычніка па 5 лістапада, за кастрычнік — з 26 лістапада па 5 снежня, а за лістапад — з 26 снежня 2016 года па 5 студзеня 2017 года. А вось пратэрмінаваная запазычанасць, якая ўтварылася на 6 лістапада, 6 снежня 2016 года і на 6 студзеня 2017-га будзе абкладацца пеняй па поўнай праграме.

У сувязі з гэтым Алег Паскробка раіць усім спажыўцам камунальных паслуг разлічвацца за іх (калі гэта магчыма па тэхнічных прычынах) па раней прынятых і звыклых графіках.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ З нагоды

# ЗА АБ'ЕКТЫЎНУЮ ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

## Эксперты — пра недапушчальнасць фальсіфікацыі гісторыі

**Днямі на пасяджэнні калегій Міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі была дасягнута дамоўленасць па супрацьдзеянні спробам фальсіфікацыі гісторыі і перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны. А на мінулым тыдні наша дзяржава ў якасці старшыні Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы выступіла з сумеснай заявай ад імя дзяржаў — членаў АДКБ пры прыняцці рашэння па рэзалюцыі «Барацьба з гераізацыяй нацызму, неанацызмам і іншымі відамі практыкі, якія спрыяюць эскалацыі сучасных формаў расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі нецярпімасці», прадстаўленай у трэцім камітэце 71-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН.**

**Карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся ў экспертаў, чаму так важна змагацца з перапісваннем гісторыі і якім чынам супрацьстаяць яе фальсіфікацыі.**

**Вольга ПАПКО, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:**

— Апошнім часам мы назіраем вынікі вольнага стаўлення да гісторыі Другой сусветнай вайны. Яшчэ не так шмат часу прайшло пасля яе заканчэння, ёсць магчымасць пагаварыць з жывымі сведкамі, а нацызм знаходзіць сабе новых прыхільнікаў сярод моладзі. Асабліва гэты працэс актыўна назіраецца ў тых краінах, дзе асэнсаванне вынікаў вайны перастала быць часткай сістэмы адукацыі і выхавання. З гэтай нагоды мне ўспамінаецца сустрэча з адным пажылым жыхаром Гамбурга, якая адбылася ў Брэсцкай крэпасці каля дзесяці гадоў таму. Вайну ён перажыў падлеткам. Пад уражаннем ад Брэсцкай крэпасці ён мне прызнаўся: не ведаў, што гэта было так жудасна. Адзначыў, што падобныя музеі павінны існаваць, каб людзі ніколі болей не захацелі ваяваць...

Зразумела, што ў кожнай краіны, нават у кожнага чалавека, будзе свая пазіцыя наконт нейкіх аспектаў Другой сусветнай вайны. Але нельга скажаць факты, кажу гэта вам як гісторык. Супрацьстаяць фальсіфікацыі можна толькі маючы актыўную грамадзянскую пазіцыю. Мне вельмі імпануе той пасыл, які наша краіна абараняе перад светам: мы супраць любой праявы вайны, таму што перажылі адну з самых жудасных войнаў за ўсю гісторыю чалавецтва. Расказваем аб гэтым сваім дзецям, гатовы расказаць пра гэта кожнаму іншаземцу, які прыязджае ў Беларусь. Лічу, што ў гэтым кірунку вельмі актыўна працуюць нашы музеі, асабліва мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Зусім нядаўна ў рамках кінафестывалю «Лістапад» я наведала паказ старога савецкага фільма «Усходні калідор», які быў зняты роўна 50 гадоў таму. Гледзячы на вялікім экране гэтую стужку, поўную трагізму і бессэнсоўных смерцяў ні ў чым не павінных людзей, я думала, як важна звяртацца да тэмы вайны ў любым узросце — каб не забываліся асабістыя трагедыі нашых дзядоў і прадзедаў, якія жылі ў той час.

Лічу, што зварот да тэмы фальсіфікацыі гісторыі вайны толькі вельмі слушны і своечасовы менавіта зараз. Сучасныя сродкі масавай інфармацыі дазваляюць хутка распаўсюджваць розныя пранацысцкія ідэі і вучэнні, таму павінна быць такое самае супрацьдзеянне. І роля Беларусі ў гэтым працэсе вельмі важная: мы маем цяжкі вопыт за сваімі плячыма і павінны імкнуцца зрабіць усё, каб больш такога не здарылася.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт:**

— На жаль, у сучасным нестабільным свеце шматлікія спробы перагляду і скажэння гістарычнага мінулага не спыняюцца. На Захадзе фактычна створана сістэма па прасоўванні перакручанага погляду на падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Існуе нават палітычны заказ на прапаганду такіх поглядаў праз грамадскія арганізацыі і сістэму адукацыі.

Наш святы абавязак перад продкамі і нашчадкамі — актыўна супрацьстаяць фальсіфікацыі айчыннай гісторыі. І рабіць гэта разам з Расіяй, з якой у нас вялізная агульная гісторыя, несумненна будзе прасцей.

Вучоныя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўжо шмат гадоў вядуць у гэтым напрамку сістэмную работу, у рамках якой мы плённа ўзаемадзейнічаем з Інстытутам усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук, гістарычным факультэтам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава, рэгіянальнай грамадскай арганізацыяй «Нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Масквы», расійскім фондам «Гістарычная памяць», прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Але гэта зусім не азначае, што мы можам самазаспакойвацца. Для таго каб сістэма гістарычнай памяці і патрыятычнага выхавання маладога пакалення паспяхова функцыянавала ў рамках усёй Саюзнай дзяржавы, неабходны штодзённая карпатлівая работа і ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, навуковай супольнасці і сістэмы адукацыі. Толькі так мы зможам умацаваць аб'ектыўную гістарычную памяць, выпрацаваць у нашым грамадстве імунітэт да спроб фальсіфікацыі гісторыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Дзеля памяці

# «ЯГО ЗОРКА І СЁННЯ ГАРЫЦЬ...»

**Гэтымі днямі Чэрвень вітаў даследчыкаў жыцця і прыхільнікаў творчасці Максіма Багдановіча. Як жылося яго продкам у старажытным Ігумене (як вядома, гэта радзіма маці паэта Марыі Мякоты)? Чым быў адметны час іх сталення?.. На гэтыя і многія іншыя пытанні можна было пачуць адказы падчас навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння паэта.**

Дырэктар уздзенскай школы №2 імя Кандрата Крапівы Алена Іргачова прыгадала Магдалену Радзівіл і яе асветніцкую работу ў гэтым краі. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры школы №2 імя Андрэя Флегантава горада Чэрвеня Валянціна Сцянько расказала пра мясцовыя карані Максіма Багдановіча — прадставіла кароткія нарысы пра жыццё кожнага з яго родных, звязаных з гэтай зямлёй.

Краязнаўца, пісьменнік Іван Ярашэвіч зрабіў вялікую работу па вывучэнні творчасці мясцовых мастакоў — тых, хто сілкаваўся ў сваіх задумах энергіяй Багдановіча, хто ў сваіх карцінах здолеў выявіць ідзі, блізкія Максіму.

**Намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўны рэдактар часопіса «Родная прырода» Алена СТЭЛЬМАХ** прадставіла Выдавецкі дом «Звязда». Яна адзначыла:

— 25 гадоў — такі адрэзак зямнога шляху быў наканаваны Максіму Багдановічу. Ён сведчыць пра тое, што жыццё чалавека вымяраецца не гадамі, а тым, што ён паспеў зрабіць за гэты час. Зорка паэта і сёння гарыць на небасхіле не толькі беларускай літаратуры, але і сусветнай. Яна западае ў сэрца кожнага чытача, хто хоць крыху сутыкнуўся з творчасцю паэта...




**Памятная дошка на адным з дамоў горада нагадвае, што тут нарадзілася маці Максіма Багдановіча Марыя МЯКОТА.**

Нібы здзейсніць падарожжа ў часе, перанесціся ў эпоху жыцця маці Багдановіча прысутным дапамагла **настаўніца беларускай мовы і літаратуры чэрвеньскай сярэдняй школы №4 Алена АШЭЙЧЫК:**

— Тады ў горадзе дзейнічалі драўляная праваслаўная царква, тры яўрэйскія малітоўныя дамы, адна сінагога і касцёл. Касцёл быў надзвычай прыгожы звонку і ўнутры адметна аздоблены. З усіх бакоў яго акружаў сад, тут жа размяшчаўся добра дагледжаны агарод. За метраў трыста ад касцёльнага плота знаходзіліся могілкі, якія і сёння ёсць у Чэрвені, — яны размяшчаліся на самым высокім месцы (як патрабавалі законы таго часу). У розныя бакі разыходзіліся вуліцы — Маларасейская, Касцельная і Азёрская. Назвы вуліцам у той час даваліся ў залежнасці ад таго, якая пабудова на іх размяшчалася. У 1897 годзе ў Ігумене правялі перапіс насельніцтва. Высветлілася, што тут жылі 4573 чалавекі. І толькі 40% з іх былі пісьменнымі...

У чэрвеньскай гімназіі №1 імя Уладзіміра Караля, дзе праходзіла канферэнцыя, прадстаўлена багатая экспазіцыя літаратуры, прысвечанай Багдановічу. Гэта і грунтоўныя даследаванні, і падручнікі, і метадычная літаратура. І, вядома, той самы «Вянок». Няма сумненняў, што, дакранаючыся да творчасці паэта, не толькі мастакі, але і навучэнцы гімназіі, многія іншыя жыхары і госці горада паўней адчуюць прыгажосць вершаваных радкоў класіка, якія і сёння зачароўваюць сэрцы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*г. Чэрвень*




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Перад удзельнікамі літаратурнага свята выступае метадыст цэнтра выхаваўчай работы Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Наталля ОБУХАВА.**

■ Падпіска-2017

## СУСТРЭНЕМСЯ Ў РЭЧЫЦЫ!

**Звяздоўскія сустрэчы з чытачамі ўжо сталі добрай традыцыяй. Ведаем, што паўсюль нас чакаюць людзі, якім даспадобы наша газета. Таму і накіроўваемся штодня па чарговым маршруце.**

**Сёння мы працуем у Пінску, а заўтра рушым на Гомельшчыну — у Рэчыцкі раён. Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца 25 лістапада з 12 да 15 гадзін на Рэчыцкім раённым вузле паштовай сувязі. Абавязкова завітайце!**

■ Добрая навіна

## ДАБРЫНЯ РАТУЕ

### Новы рэанімабіль перададзены Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы

**Такі падарунак быў набыты ў ходзе дабрачыннага сацыяльнага праекта «Беларусбанк. Вектар дабрыні». Раней у вобласці было толькі чатыры рэанімабілі, якія не спраўляліся з нагрузкай. Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Гродзенскай абласной інфекцыйнай клінічнай бальніцы Алена КРАТКОВА расказала, якім чаканым аказаўся падарунак.**



Фота БЕЛТА.

— У вобласці існуе толькі дзве бальніцы: інфекцыйная клінічная, дзе прадугледжана 65 ложкаў для непаўналетніх пацыентаў, і дзіцячая абласная клінічная бальніца, — гаворыць Алена Мікалаеўна. — Трэба разумець, што ў рэанімацыю дзяцей вязуць з усёй вобласці ў цяжкім і вельмі цяжкім стане. Тыя рэанімабілі, якія меліся дагэтуль, увесь час занятыя. Часам ва ўмовах рэанімабіля хворага трэба не толькі даставіць з далёкіх раёнаў у Гродна, але і везці ў сталіцу. Ва ўмовах такой невялікай колькасці аўтамабіляў зрабіць гэта было складана. У цэлым, падарунак не столькі для бальніцы, колькі для дзяцей. Ва ўрачоў ёсць нашмат менш часу для аказання экстраннай дапамогі дзецям, бо часам лік ідзе не на гадзіны, а нават на хвіліны. А ў рэанімабілі ёсць магчымасць і падтрымліваць дыханне, і прымяняць інтэнсіўныя метады рэанімацыі. Я ўжо павіншавала галоўнага ўрача Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Гэта вялікае дасягненне і падмога. Такі праект — добры прыклад, як вялікія прадпрыемствы ці банкі могуць дапамагаць вырашэнню сацыяльных пытанняў.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## На старт з поўнай абоймай

### У нядзелю пачынаецца біятлонны сезон

**Першы этап Кубка свету пройдзе ў шведскім Эстэрсундзе, спаборніцкая праграма 27 лістапада адкрыецца змешанай эстафетай, а працягнецца індывідуальнымі гонкамі, спрынтам і праследаваннем.**

Напярэдадні трэнеры зборнай назвалі склад, які выступіць на першым этапе. У жаночай камандзе на старт выйдуць Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Надзея Пісарава, Анастасія Кінунен (Дубарэзава), Дар'я Юркевіч і Хрысціна Ільчанка. Мужчынскую частку каманды прадставяць Уладзімір Чапелін, Сяргей Бачарнікаў, Раман Елятноў, Юрый Лядаў і Максім Варабей.

Біятланісты, якія не трапілі ў асноўны склад, плануюць выступіць у Кубку IBU ў нарвежскім Бейтасталене, дзе першая гонка адбудуцца яшчэ раней — 25 лістапада.

Нагадаем, што за два месяцы да старту сезона пасаду галоўнага трэнера зборнай Беларусі пакінуў расійскі спецыяліст Валерый Пальхоўскі, які ўзначаліў каманду ў маі. Яго месца ў экстраным парадку заняў вопытны айчынны настаўнік Юрый Альберс, які да гэтага адказваў у федэрацыі біятлона за правядзенне міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтваў.



**Сёлета беларускія біятланісты выступяць у новых гоначных касцюмах. На камбінезоне ярка-малінавага колеру ёсць фрагменты нацыянальнага арнаменту, а таксама размешчаны лагатыпы і назвы спонсараў. На фота: Дар'я ЮРКЕВІЧ і Дзінара АЛІМБЕКАВА.**

Сёлетні сезон будзе складацца з дзевяці этапаў Кубка свету, які завяршыцца ў сакавіку 2017 года, а таксама сусветнага першынства. Спартыўны тэлеканал краіны «Беларусь 5» плануе асвятляць усе гэтыя спаборніцтвы ў поўным аб'ёме. Прамыя трансляцыі біятлонных гонак стартуюць разам з адкрыццём сезона 27 лістапада. Кіраўніцтва канала адзначыла, што ўсе гонкі Кубка свету гледачы змогуць убачыць і ў паўторы — у вячэрнім эфіры, а таксама на наступны дзень.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## З ЮБІЛЕЕМ, СЛАЎГАРАД!

**Адзін з найстарэйшых гарадоў Магілёўскай вобласці адзначае 880-гадовы юбілей. У розныя гады свайго жыцця ён быў Прупоем, Прапойскам, Прапойскам. Слаўгарадам стаў пасля свайго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гонар пераможцаў 25 лістапада адбудзецца мітынг каля брацкага пахавання ў гарадскім парку, кветкі ад удзячных патомкаў лягуць да памятных знакаў мужным вызваліцелям.**

Галоўнай падзеяй святочнага тыдня стала адкрыццё помніка невядомаму лётчыку на гарадскіх могілках. «Звязда» ўжо пісала, што пра гэтую гісторыю часоў вайны паведаміла падчас звароту ў Слаўгарадскі райвыканкам мясцовая жыхарка Ганна Лурыкава. Калі нямецкія танкі толькі падступалі да горада, адважны герой уступіў у няроўны бой з нямецкімі знішчальнікамі і загінуў. Раённыя ўлады падтрымалі ідэю ўвекавечыць яго подзвіг, і за кошт сродкаў Фонду міру былі пастаўлены помнік. Адным з цікавых мерапрыемстваў свята стала адкрыццё выставы ў раённым гісторыка-краязнаўчым музеі «Вобразы роднай Слаўгарадчыны», якая нагадвае пра таленавітых ураджэнцаў гэтага краю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ЗААДНО ВЫРАТАВАЛІ АД ПАЖАРУ

**Старшы лейтэнант міліцыі Аляксандр ВІШНЯВЕЦКІ, прапаршчыкі міліцыі Анатоль САЛАДУХІН і Дзмітрый СТАНКЕВІЧ атрымалі падзяку ад сям'і з Клімавіч за тое, што выратавалі іх ад вялікай бяды. Усе гэтыя героі — супрацоўнікі атрада міліцыі асаблівага прызначэння палка патрульна-паставой службы УУС Магілёўскага аблвыканкама.**

— У Клімавічах яны знаходзіліся ў службовай камандзіроўцы — аказвалі дапамогу мясцоваму РАУС у папярэджанні крадзяжоў аўтамабіляў, — расказала **супрацоўнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязей УУС Магілёўскага аблвыканкама Юлія ХАЛАМЕЕВА.** — Праходзячы па вуліцы Герцэна, яны ўбачылі прыкладна за кіламетр, што нешта гарыць. Выклікаўшы па мабільным тэлефоне ратавальнікаў, пабеглі да месца пажару. Агонь ужо ва ўсю моц гаспадарыў у лазні і ў любы момант мог перакінуцца на жылую пабудову. Падзеі адбываліся ноччу, і ў доме ўжо спалі. Праваахоўнікі пачалі грукаць у дзверы і паднялі ўсіх на ногі. У доме жылі пенсіянеры, якія разгубіліся ад нечаканасці. Таму спатрэбілася дапамога міліцыянераў, каб іх аператыўна вывесці ў бяспечнае месца.



Фота Валерыя ЦІМАФЕЕВАЙ.

— Дзякуй, што не прайшлі міма, — напісала ў падзячным лісце да начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама палкоўніка міліцыі Аляксандра Кавальчука жонка гаспадара Святлана Жарына. — Калі б не чуласць і ўвага з боку вашых супрацоўнікаў, памеры нашага няшчасця маглі б быць вельмі вялікімі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## КАЗКА Ў КОЖНЫ ДОМ

**Белпошта прапануе заказаць традыцыйную навагоднюю паслугу. «Віншаванне Дзеда Мароза» — гэта ліст з цёплымі пажаданнямі ці падарунак з мяккай цацкай (сімвалам будучага года — пеўнем).**

Аформіць і аплаціць паслугу можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі з дапамогай інтэрнэт-сэрвісу «Віншаванне Дзеда Мароза» (з магчымасцю разліку банкаўскай карткай) у паштальёна. Заказы па тэрыторыі Беларусі прымаюцца да 22 снежня, у краіны СНД і далёкага замежжа — да 1 снежня. Па 30 лістапада, дарэчы, дзейнічае зніжка 10 працэнтаў.

А самыя маленькія могуць даслаць ліст Дзеду Марозу ці Снягурцы. У круглай зале сталічнага Паштамта для іх паставілі спецыяльную скрыню. Лісты да любімых навагодніх персанажаў можна адправіць таксама ў любым аддзяленні сувязі. Нагадаем, што адрас «марозаўскай» рэзідэнцыі — Белавежская пушча (225063, вёска Каменюкі, Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# КАЛІ ЭКСКУРСАВОД — СМАРТФОН



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Брэсцкая крэпасць, якую ўсе бачылі, — гэта толькі 30% тэрыторыі або менш чым палова аб'ектаў, якія знаходзяцца на месцы мемарыяла, — расказвае **намеснік дырэктара па праектах Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці Аліна ДЗЕРАВЯНКА.** — Большасць аб'ектаў недаступна ўвазе наведвальнікаў, пра іх мала хто ведае, акрамя краязнаўцаў і людзей, якія цікавяцца гісторыяй. Не шмат і тых, хто ўвогуле ведае гісторыю Брэсцкай крэпасці. У прыватнасці, што горад Брэст да сярэдзіны XIX стагоддзя знаходзіўся на тэрыторыі крэпасці (калі Расійская імперыя вырашыла ўмацаваць свае межы, яна пабудавала крэпасць на месцы старога горада). Тут жа знаходзяцца аб'екты, якія датуюцца нават XVII стагоддзем: напрыклад, бернардзінскі манастыр. Ёсць і вялікі комплекс архітэктуры XIX стагоддзя. Адным словам, гэта багатая і шматслойная гісторыя, якая ніякім чынам не рэпрэзентавана.




Выправіць памылку паспрабавалі Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці і брэсцкі філіял кампаніі EPAM Systems. У запушчаным імі мабільным дадатку адлюстраваны аб'екты, якія расказваюць пра розныя гістарычныя перыяды тэрыторыі, дзе сёння знаходзіцца знакаміты мемарыяльны комплекс. Дадатак напоўнены інфаграфікай — тут адзначаны музеі, манументы, кафэ і нават месцы продажу сувеніраў. Будучы на тэрыторыі крэпасці, дзякуючы геалакацыі, ён падкажа, каля якога аб'екта вы знаходзіцеся і як прайсці туды, што вас цікавіць. Дадатак даступны на рускай і англійскай мовах. У бліжэйшы час кантэнт будзе пададзены і па-беларуску.

— Усюды, дзе мы ні бываем у Беларусі, калі судакранаемся з музейнай прасторай і іншымі, звязанымі з гістарычнай спадчынай рэчамі, мы адчуваем сябе бездапаможнымі суб'ектамі, — лічыць **гісторык, выкладчык ECLAB Аляксей БРАТАЧКІН.** — Усё зроблена такім чынам, каб у пэўнай ступені намі дырыжыраваць. Вельмі складана быць у музеі самастойным. Часта няма альтэрнатывы экскурсіям. Аўдыягіды, QR-коды — гэта справа толькі апошняга часу.

**У рэжыме «афлайн» можна пазнаёміцца з гісторыяй 60 аб'ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі комплексу, убачыць звыш 200 архіўных і сучасных фотаздымкаў, а таксама самастойна павандраваць па малавядомай частцы крэпасці.**

Сапраўды, у Беларусі не вельмі развіта сетка мабільных дадаткаў па музеях або мемарыяльных комплексах. У той час, як за мяжой — гэта своеасаблівы трэнд у музейнай справе. У XXI стагоддзі ўжо мала пачуць інфармацыю ад экскурсавода. Сучасны наведвальнік адразу ж хоча ўбачыць, як той ці іншы аб'ект выглядаў у розныя гістарычныя перыяды, якія людзі мелі да яго дачыненне...

Але чамусьці некаторыя музейшчыкі бачаць у сучасных тэхналогіях канкурэнта. Хоць зразумела, што нават самы ўдасканалены інтэрфейс мабільнага дадатку не заменіць жывога аповеду экскурсавода і рэальнага, а не віртуальнага бачання гістарычнай спадчыны. Распрацоўшчыкі мабільнага дадатку ўлічылі прапановы і пажаданні супрацоўнікаў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Але гэта не значыць, што кропка пастаўлена: мабільны дадатак можна ўвесь час удасканальваць.

Спецыялісты Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці плануюць паказаць, што было на месцы крэпасці да яе ўзнікнення і як крэпасць выглядала ў 1930-я, 1940-я і наступныя гады. «Мы ўжо ведаем, як увогуле можна расказаць пра старажытны Брэст, які па прыгажосці часта параўноўваюць з Гродна», — дзеліцца задумкамі Аліна Дзеравянка.

— Было б цікава пабачыць, як мяняліся ўяўленні аб Брэсцкай крэпасці на працягу доўгага часу, у тым ліку ў гістарычнай памяці беларусаў, — перакананы гісторык Аляксей Братачкін. — У мабільным дадатку яна падаецца як савецкі брэнд. Але калі паглядзець шырока на гісторыю мемарыяла, то яна захоўвае шмат чаго цікавага. Напрыклад, у турме Брэсцкай крэпасці сядзелі тыя, хто ўдзельнічаў у паўстанні 1863—1864 гадоў, у розны час, але амаль у адным месцы, тут утрымліваліся Фелікс Дзяржынскі і вядомы дзеяч украінскага нацыяналістычнага руху Сцяпан Бандэра. І пастаянна мы бачым адсылкі да гісторыі, якія гэты савецкі трэнд аб Брэсцкай крэпасці значна пашырае і прапаноўвае нам паглядзець на Брэст інакш.

«Але рэакцыя людзей на іншы матэрыял аб Брэсцкай крэпасці сведчыць аб тым, што ён іх не задавальняе, — гаворыць Аліна Дзеравянка. — Усім цікава пачуць пра гераічную абарону крэпасці ў чэрвені 1941-га. Гэта да пытання наконт таго, наколькі людзі гатовы да больш шырокага аповеду».

А што хочаце ведаць пра Брэсцкую крэпасць вы? Калі больш за тое, што прапаноўваюць школьныя падручнікі, то паспрабуйце звярнуцца да мабільнага дадатку (http://www.brestheritage.by/archives/2132).

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ЗАМЕСТ ВІНАГРАДУ І ПЕРСІКАЎ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва ў нас перавышае паказчыкі партнёраў па ЕАЭС. Збожжа мы атрымліваем 912,3 кг (у Расіі — 712,4), мяса — 121 кг (у Расіі — 63, Казахстане — 53, Кыргызстане і Арменіі — 35 кг), малака — 743 кг (у Расіі — 210, Казахстане — 293), яек — 402 шт. (у Расіі — 290, Казахстане — 269). У той жа час рэальныя грашовыя даходы насельніцтва знізіліся летась амаль на 6 працэнтаў. Удзельная вага насельніцтва з даходамі ніжэй за пражытковы мінімум склала 3,6 працэнта. Павялічваецца і доля расходаў на харчаванне ў структуры агульных расходаў насельніцтва (да 42 працэнтаў). Адсюль — зніжэнне даступнасці для пакупніка асноўных прадуктаў.

У хатніх гаспадарках гарадоў больш спажываюць малочных і мясных прадуктаў, гародніны і фруктаў, у сельскай мясцовасці — больш хлеба. Летась у параўнанні з папярэднім годам значна вырасла ўдзельная вага спажывання прадуктаў з асабістай прысядзібнай гаспадаркі. У сельскіх населеных пунктах гэты рост адбыўся па малаку, мясе, рыбе, яйках, бульбе, гародніне, фруктах і ягадах.

За апошнія 6 гадоў узровень спажывання высокакаштоўных відаў мяса (ялавічыны, цяляціны, бараніны) не павялічваецца, але выраслі пакупкі мясных паўфабрыкатаў, катлет, каўбасных вырабаў. Пры тым, што ў цэлым спажыванне малака і малочных прадуктаў насельніцтвам недастатковае, скараціўся аб'ём пакупкі на сям'ю ёгуртаў, тлустага тварагу, смятаны, кефіру, а павялічыўся — тварагу нятлустага, цвёрдых сыроў і пастэрызаванага малака.

Недастатковым было і спажыванне свежай гародніны. Калі з 2010 года аб'ём пакупкі салодкага перцу, памідораў, баклажанаў, агуркоў істотна прырос, то летась моцна скараціўся. Вырасла спажыванне больш танных відаў айчыннай прадукцыі — морквы, цыбулі і буракоў. Менш беларусы набывалі летась і вінаграду, персікаў, абрыкосаў, цытрусавых, яблык, груш і бананаў.

Паводле статыстыкі, спажыванне дарагіх і каштоўных прадуктаў абмяжоўваецца з павелічэннем колькасці дзяцей у сям'і. Хатнія гаспадаркі з адным дзіцем спажываюць 82 кг мяса і 16 кг рыбы на чалавека, з трыма дзецьмі — адпаведна 69 і 13 кг. У сем'ях з трыма дзецьмі адзначаецца самае высокае спажыванне бульбы, хлеба і хлебапрадуктаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## Кампетэнтна

— Сёння з'яўляецца новая сыравіна, новыя хімічныя злучэнні, дабаўкі, таму мы працуем над удасканаленнем паказчыкаў якасці, — кажа **генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Зянон ЛОЎКІС.** — Працягваем, напрыклад, даследаваць пальмавы алей — пакуль няма методыкі, якая дазволіла б выявіць яго колькасны паказчык у тым ці іншым прадукце. Першыя высновы адносна ўплыву пальмавага алею на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы пакуль указваюць на шкодны ўплыў для здароўя. Да 2006 года ў краіну завозіліся толькі фальсіфікаваныя сокі, а мы распрацавалі параметры, па якіх устанаўліваем іх карысць, і цяпер усе айчынныя прадпрыемствы ўкаранілі нашы стандарты і выпускаюць дастойную прадукцыю. Другім важным пытаннем застаецца неабходнасць тлумачыць нашым дзецям, што карысна, а што не вельмі. Пачалі работу ў дашкольных і школьных установах па навучанні дзяцей правільнаму харчаванню, каб яны ведалі, што такое «пустыя» калорыі.

— Айчынная прадукцыя абсалютна якасная і канкурэнтная ў параўнанні з той жа еўрапейскай, сусветнымі брэндамі, — падкрэслівае **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Трэба наогул імкнуцца ўжываць тое, што расце на канкрэтнай тэрыторыі. У бліжэйшы час мы поўнасцю забяспечым сябе ў тым ліку і яблыкамі — яны больш адаптаваныя і да нашых умоў вытворчасці. Завезеныя яблыкі 18 — 25 разоў за сезон апрацоўваюцца хімічнымі прэпаратамі. Гэта забяспечвае добры таварны выгляд, але рэкамендаваць іх дзецям не варта. Уся наша прадукцыя тым часам знаходзіцца пад больш жорсткім кантролем якасці і бяспекі.

■ Сезон прастуды

# Зіма на парозе

## Не забылі прышчапіцца ад грыпу?

**Яшчэ ёсць час звярнуцца ў паліклінікі ці іншыя медустановы для правядзення вакцынацыі ад грыпу — бясплатнай, калі вы ў групе рызыкі, або за свой кошт.**

Сітуацыя па вострых рэспіраторных інфекцыях адпавядае зараз таму ўзроўню, які звычайна рэгіструецца ў гэты час. Пераважаюць, галоўным чынам, адэнавірусы, вірусы парагрыпу і іншыя. Захваральнасць не перавышае ўзровень мінулага года. Аднак чым бліжэй зіма, тым больш хворых.

Эпідэмічны пад'ём грыпу чакаецца па традыцыі напрыканцы студзеня — пачатку лютага. «Асаблівых новых вірусаў мы не чакаем, — кажа **галоўны эпідэміёлаг, намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Гэта будзе звычайны сезон, і будзем спадзявацца, што тая колькасць людзей, што прайшла вакцынацыю, забяспечыла сабе дастатковы ўзровень імуннага адказу для папярэджання грыпу або яго цяжкіх ускладненняў».

Актыўная фаза кампаніі вакцынацыі завершыцца на пачатку снежня, хоць у індывідуальным парадку можна прышчапіцца і ў наступным месяцы (аднак лепей усё ж паспець да 1-га чысла). Грып — адна з самых цяжкіх інфекцый, а вакцынацыя эфектыўна абараняе чалавека ад захворвання. На канец мінулага тыдня ў краіне ўжо больш за 3,5 млн чалавек скарысталіся такой абаронай. Большасць атрымала прышчэпкі за бюджэтныя сродкі — гэта ўсе, хто мае высокую рызыку развіцця ўскладненняў пасля грыпу, — людзі з хранічнымі захворваннямі, тыя, каму 65+, цяжарныя, дзеці ва ўзросце ад 6 месяцаў да 3 гадоў. Яшчэ адна група — дзеці ў дашкольных установах, школьнікі, студэнты ВНУ, работнікі гэтых устаноў, а таксама медперсанал. Ва ўсіх краінах гэтыя групы ахопліваюцца вакцынацыяй не менш як на 75 працэнтаў. У нас на сёння ўжо больш за 70.

У апошнія дзесяцігоддзі актыўна цыркулююць чатыры вірусы грыпу — два вірусы грыпу А і два вірусы грыпу В. Яны здольныя выклікаць эпідэміі. Эпідэмічны сезон па грыпе ў краінах паўночнага паўшар'я пачынаецца з 40-га каляндарнага тыдня і працягваецца да 20-га наступнага года. Сітуацыя ў краінах паўночнага паўшар'я пакуль спрыяльная, узровень захваральнасці характэрны для міжэпідэмічнага часу, адзначаюць спецыялісты. Рэгіструецца адзінкавыя выпадкі пераважна віруса грыпу А (H3N2).

Не забывайцеся на старыя добрыя меры прафілактыкі ў дачыненні да паветрана-кропельных інфекцый. Пазбягайце людных месцаў: менш людзей — менш вірусаў. Гуляйце і праветрывайце памяшканне: канцэнтрацыя вірусаў на адкрытай прасторы ў тысячу разоў ніжэйшая. Будзьце ўважлівымі ў транспарце (калі нехта побач чхае, прыкрывайцеся). Мыйце рукі (яшчэ і кішэнных інфекцый пазбегнеце). Маску павінен насіць дома хворы, каб не заразіць сваіх блізкіх, але на вуліцы яна не патрэбна ў тым ліку і яму. Наогул, нашэнне маскі — не панацэя ад усіх вірусаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 22 (65)



# ЗАМУЖ ЗА... ГРОШЫ

Знаёмая закахалася. Вочы ажно свецяцца ад шчасця. «Мы з Алесем учора пасля танцаў (яны ходзяць разам на беларускія народныя танцы) прагаварылі тры гадзіны. Ён такі ўважлівы, чулы, разумны... І так мяне разумее...» На наступны дзень сустрэла яе, ужо заклапочаную. «Вырашыла падзяліцца сваім шчасцем з маці, — уздыхае Таня. — Не, каб парадавацца за мяне, дык яна адразу накінулася з пытаннямі: «Кім працуюць яго бацькі? Ці мае кватэру ў Мінску?..»

Іншая прыяцелька, таксама прыгажунька, паслухалася маці і выйшла замуж «за кватэру». Цяпер амаль пры кожнай сустрэчы скардзіцца: «Ледзь якая сварка, муж заўсёды не праміне нагадаць, з якой «галечы» ён мяне выцягнуў. І ўсё, што ў мяне ёсць сёння, — гэта дзякуючы яму». Яна, бачна, пакутуе ў сваёй «залатой клетцы» і рэгулярна ходзіць да псіхолага ратавацца ад дэпрэсіі.

Нядаўна калега напісала пра тое, як разводзілася са сваім першым мужам. «Ён прыйшоў а палове на сёмую раніцы і спытаў: «А вось гэтыя хрустальныя келіхі хто дарыў? З твайго боку ці з майго?» Я аддала яму і гэтыя келіхі, і чайныя лыжкі, і нават нажніцы для разбірання курыцы (іх чамусьці было асабліва шкада аддаваць, але справа прынцыпу), астатняе — халадзільнік з прадуктамі, тэлевізар і кухонны стол — ён панёс сам, калі я залізвала раны, з'ехаўшы да яшчэ халоднага і вельмі Чорнага мора. Менавіта тады я зразумела, што тваё — толькі тое, што ты зарабіла сама. І з таго часу зарабляю. Каб ніколі не апынуцца ў сітуацыі, на якой робіць рэйтынгі шматлікія ток-шоу: яна — жонка мільянера, якая яшчэ ўчора купалася ў раскошы, а сёння ён пакінуў яе без усяго».

Прасцей, сапраўды, прыйсці на ўсё гатовенькае, але, як мне падаецца, лепш (ды і цікавей) дасягаць усяго разам. На момант, калі я выходзіла замуж, мой жаніх быў беспрацоўным. Хадзіў на курсы па складанні бізнес-плана, каб атрымаць субсідыю і адкрыць сваю справу. У гэты нялёгкі перыяд і яго, і мае бацькі перажывалі: маўляў, «звольніўся з працы, за што ж ты будзеш жыць, а раптам не атрымаецца?» Але я, нягледзячы на гэты псіхалагічны ціск, шчыра верыла і падтрымлівала. Нядаўна муж сказаў: «Я так рады, што ты выйшла замуж за мяне, а не за мае грошы». Усведамляць гэта, напэўна, — шчасце для любога мужчыны. Недарэмна ж прынц апранаўся ў бедняка, калі шукаў сваю прынцэсу. І прынцэса, часам, таксама...

...Адзін кароль абвясціў, што мужам прынцэсы стане той, хто будзе яе кахаць усё жыццё. У прызначаны дзень сотні жаніхоў сабраліся ў палацы. Дзяўчына пaглядзела на прыбраных юнакоў і задумалася. Потым паклікала свайго мудрага настаўніка і доўга гутарыла з ім. «Я не буду сёння размаўляць з жаніхамі, — абвясціла прынцэса. — Падзяліце іх на групы. Хай першая група прыедзе заўтра ўвечары». Сама ж тым часам пераапранулася ў лахманы і стала з кошыкам кветак пры дарозе. Калі міма праехаў першы жаніх, шляхетны рыцар на кані, «жабрачка» папрасіла: «Купіце букецік». — «Прэч з дарогі, жабрачка», — крыкнуў рыцар і паскакаў. Так зрабілі ўсе юнакі, якія спяшаліся ў гэты дзень у палац. Увечары прынцэса адмовіла ўсім жаніхам. Тое ж паўтарылася і на другі дзень, і на трэці. — «Дачушка, чаму ты ўсіх прагнала?» — устрывожана запыталася каралева. — «Яны не здольныя бачыць прыгажосць, мама».

Прайшоў месяц. Жаніхі апошні групы сабраліся ў палацы. Не было толькі аднаго з іх ды самой прынцэсы. Яны з'явіліся разам. І прынцэса абвясціла, што знайшла свайго нарачонага. Потым яна распавяла каралеве: «Мой настаўнік сказаў мне: «Каханне таго пражыве да канца жыцця, хто пакахае цябе ў лахманах». Кожны дзень я пераапраналася ў старую вопратку і чакала жаніхоў каля дарогі. Толькі гэты юнак спыніўся і купіў у мяне букет. Ён сказаў, што я прыгожая».

Калісьці даўным-даўно на нашай планеце была выспа, на якой жылі ўсе каштоўнасці. Але аднойчы іх дом пачаў сыходзіць пад ваду. Каштоўнасці селі на свае караблі і сплылі. На выспе засталося толькі Каханне. Яно чакала да апошняга, але, калі знаходзіцца на выспе стала небяспечна, таксама захацела сплысці. Каханне паклікала Багацце і папрасілася да яго на карабель. «На маім караблі шмат золата, для цябе тут няма месца», — пачула ў адказ. Тады Каханне папрасіла аб дапамозе Журбу. «Выбачай, я настолькі сумная, што мне трэба заўсёды заставацца ў адзіноце». Побач праплывала Радасць, але тая была так занятая весялосцю, што нават не пачула просьбу. Калі Каханне зусім страціла надзею, аднекуль ззаду данёсся голас: «Хадзем, Каханне, я вазьму цябе з сабой». Каханне азірнулася і ўбачыла старога. Ён давёз яго да сушы і знік за гарызонтам. Толькі тады Каханне спахапілася: «Я ж забылася спытаць імя свайго выратавальніка!» Тады яно звярнулася да Пазнання: «Скажы, Пазнанне, хто быў гэты стары?» — «Час». — «Але чаму ён выратаваў мяне?» — «Таму што толькі Час ведае, наколькі важнае ў жыцці Каханне...»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

*nadzieja@zviazda.by*

■ Гарманічнае развіццё

# ДЗІЦЯЧЫ САДОК МАРЫ

## адкрылі ў Гродне дзве экадружалюбныя матулі

**Рыма УШКЕВІЧ і Таццяна ВАЛОШЧЫК лічаць, што чалавек можа дасягнуць большага, калі займацца яго развіццём з самага нараджэння. Таму і стварылі першы ў нашай краіне экалагічны садок «Ветка», дзе, акрамя сваіх дзяцей, развіваюць і вучаць сябраваць з прыродай і чужых. Пакуль Таццяна рыхтавала з малымі пальчыкавы спектакль, я пацікавілася ў Рымы, чым іх міні-праект адрозніваецца ад шматлікіх цэнтраў ранняга развіцця.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Наталлі БУЛЫГІ.

**Рыма УШКЕВІЧ і Таццяна ВАЛОШЧЫК разам са сваімі выхаванцамі ў экакасцюмах з крафт-паперы, якія рабіла мастачка Галіна Абуховіч.**

■ Ніткі сяброўства

# Вывучыцца на лагіста і стаць заможным чалавекам

## Як малады бізнесмен дапамагае хлопцу з дзетдома не заблукаць па жыцці

**Калі Руслан СУСЛАЎ паступіў у каледж, то вырашыў не расказваць аднагрупнікам, што жыў у дзетдоме. Не хацеў станавіцца ахвярай стэрэатыпаў. «Вы ж ведаеце, як ставяцца да дзяцей з інтэрната. Прападзе што-небудзь — адразу на цябе падумаюць». Сам падлетак не з ліку праблемных: стаpанна вучыцца, займаецца спортам. Не нарабіць памылак у самастойным жыцці яму дапамагае валанцёр Андрэй ПАДКАС. Хлопцы пазнаёміліся дзякуючы праграме настаўніцтва. Яе сутнасць у тым, што дарослы чалавек бярэ пад крыло выхаванца інтэрната — падтрымлівае яго, становіцца «старэйшым братам». Чым валанцёр можа дапамагчы падлетку з дзетдома і якая карысць ад шчырых размоў, — Руслан і Андрэй дзеляцца сваёй гісторыяй.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Валанцёр Андрэй ПАДКАС (злева) упэўнены: здаровыя зносіны для дзяцей з інтэрнатаў важнейшыя за канцэрты і цукеркі.**

### ПЕРЫПЕТЫІ ЛЁСУ АДНОЙ СЯМ'І

Пра жыццё ў дзетдоме Руслан расказвае коратка і неахвотна. Ён не сірата: бацькі пілі, і органы апекі палічылі, што хлопчыку (Руслану тады было 10 гадоў) і яго дзвюм малодшым сёстрам будзе лепш у іншым месцы.

— Мяне са школы забралі, я нават не зразумеў, што адбылося, — успамінае падлетак. — Міліцыя прыйшла, пачалі пытацца, што я еў. Пасадзілі ва «ўазік» — не ведаў, куды вязуць, думаў з машыны збегчы. А маю сярэднюю сястру, Аліну, настаўнік не хацеў адпускаць.

Дзяцей спачатку адправілі ў прытулак. Праз год перавялі ў дзіцячы дом №4, а калі той закрыўся, — у сёмы.

— Першы раз у жыцці без мамы дрэнна было. Яна прыехала нас наведаць толькі праз тыдзень-два. А потым стала нармальна, за некалькі месяцаў прывык.

Цяпер Руслану 16. З нядаўняга часу ён жыве ў інтэрнаце ад каледжа. У дзіцячым доме засталася яго 15-гадовая сястра Аліна. Малодшую, Жэню (ёй 14), забралі да сябе прыёмныя італьянскія бацькі. «Крыху кантактуем з ёй, — расказвае Руслан. — Пасылкі год слала. Цяпер не».

***— Твае тата з мамай спрабавалі аднавіцца ў бацькоўскіх правах?***

— Спрабавалі, але... — па паўзе падлетка разумею, што праблема з алкаголем да канца не вырашылася.

***— Не асуджаеш іх?***

— Праехалі гэту тэму даўно. Мы з бацькамі падтрымліваем зносіны. Я званю, прыязджаю да іх... Ды ў нас сям'я нармальная, проста атрымалася так.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

■ Супраць гвалту!

# ВЫРАСЛІ ДЗЕТКІ — ВЫРАСЛІ БЕДКІ



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**У міжгароднім аўтобусе разгаварыліся са спадарожніцай пра дзяцей.**

**— А мой, міленькая, сядзіць, — адкрылася пенсіянерка. — З сынам і раней рады не было. Піў бязбожна. А як мужык памёр, дык мне страшна дома заставацца. І здароўя няма, а я на работу выйшла, каб хоць з людзьмі быць і на нейкі час забывацца, у якім пекле жыву. Сын, як нап'ецца, на вуліцу гоніць, крычыць, што гэта яго хата, што ён яе спаліць. Усё пытаецца: «Калі ж ты здохнеш?» Якога я толькі бруду ад яго не чула. Не раз на мяне ўжо руку падымаў. Часам, як пойдзе ў разгон, дык уцяку на работу, на канапе ноч перасяджу. А апошнім разам душыць пачаў. Тут я міліцыю і выклікала. Забралі яго. Суд будзе (голас спадарожніцы зрываецца, дрыжачай рукой яна выцірае слязінкі з маршчыністага твару)...**

## НЕ ШКАДУЙЦЕ КРЫЎДЗІЦЕЛЯЎ!

— У сельскай мясцовасці даволі часта з пажылымі бацькамі пражываюць іх дарослыя дзеці. Многія з іх нідзе не працуюць, лічыцца, што існуюць за кошт выпадковых заробкаў (дапамагаюць па гаспадарцы суседзям). Але ўсе выдатна разумеюць, што жывуць такія людзі з пенсіі сваіх бацькоў. І гэта сапраўды бяда, калі пры гэтым яны са старых яшчэ і здзекуюцца, — расказвае **старшы інспектар Упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Мінскага аблвыканкама Марыя ЖОЛАБАВА.** — За гэты год на Міншчыне на 133,3% павялічылася колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў у сямейна-бытавой сферы, здзейсненых у дачыненні да пажылых людзей. Практычна ўсе гэтыя правапарушэнні чыняць іх блізкія (у тым ліку і дзеці), як правіла, у нецвярозым стане. Летам бывае зацішша, усе такія алкаголікі ў лесе, ягады, грыбы збіраюць. А як зімовы перыяд наступае, праблем становіцца больш. Зараз яны будуць чакаць пенсію бацькоў як невядома чаго.

**Важна, каб сваякі не пакідалі без увагі міліцыі ніводнай сямейнай драмы. Чым больш разоў «засвяціўся» скандаліст, тым больш сур'ёзным будзе пакаранне.**

Першая парада для бабуль і дзядуль: па любым факце гвалту ў сям'і звяртацца на нумар 102, не шкадаваць сваіх дзяцей, нават, калі яны толькі пагражалі. Тым больш што пагрозы бываюць розныя.

— Напрыклад, у Клецкім раёне ў выніку сваркі з маці сын схапіў сякеру і пагражаў забіць. Замоўчваннем усё толькі ўскладняецца, — працягвае Марыя Жолабава. — Калі не будуць прынятыя меры, у парушальніка ўзнікне пачуццё беспакаранасці і ўсёдазволенасці.

## КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА?

Адна справа, калі старыя пакутуюць ад дзяцей-сужыцеляў у горадзе: праз сценку хоць нехта ды пачуе. А ўявіце вёску ў пару дамоў... Дзе шукаць такім старым паратунку, калі раптам у хаце разгарыцца сямейная сварка?

— У кожным раёне створаны крызісныя пакоі, дзе ахвяры сямейнага гвалту могуць пражыць нейкі час, пакуль не вырашацца пэўныя праблемы, але толькі адзінкі выкарыстоўваюць такую магчымасць. Напэўна, трэба, каб змянілася пакаленне. У нас людзі хутчэй пойдуць да сваяка, суседа, — заўважае Марыя Жолабава.

Не пакінуць безабаронных пенсіянераў і ўчастковыя інспектары, іх тэлефоны часта запісаны ў бабуль на сцяне. Акрамя таго, на дапамогу гатова прыйсці і пошта. Многія пажылыя людзі атрымліваюць пенсію дома. Хата, калі паштальён заходзіць да іх, гэта справа не на пяць хвілін. Тут ужо і ўсе навіны, усё жыццё выкладваецца. Вядома ж, паштальёны бачаць, як дзеці-сужыцелі крыўдзяць дзядуль і бабуль, забіраюць у іх пенсію. Таму і падказаць змогуць, што рабіць. Так, калі ў каго са старых няма пад рукой канверта з маркай, баяцца пажаліцца пры крыўдзіцелях ці проста не ў стане сказаць пра сваю праблему ўголас, ёсць магчымасць паведаміць пра яе на паперы — трэба толькі лісток з інфармацыяй аб сямейным гвалце ўкінуць у паштовую скрыню. Паведамленне можа быць і ананімным, важна толькі пазначыць адрас, па якім здзяйсняецца правапарушэнне. Усе допісы будуць перададзены ў раённыя аддзелы ўнутраных спраў. Ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінаблвыканкама спадзяюцца, што такая акцыя, якая цяпер праводзіцца ў вобласці сумесна з Белпоштай, дапаможа прадухіліць злачынствы ў дачыненні да пажылых людзей.

## НА ШТО СПАДЗЯВАЦЦА?

Наколькі хутка будзе вырашана праблема сямейнага гвалту, у многім залежыць ад самой ахвяры. Пакаранне можа быць толькі па звароце!

— Калі маці шкадуюць дзяцей, ад якіх пакутуюць, нам складаней прадухіліць злачынствы. Мы нават у ЛПП не зможам накіраваць сямейнага скандаліста, калі ён раней не быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Так, на лячэнне пры адсутнасці супрацьпаказанняў па здароўі, накіроўваюць асобы, што пакутуюць на хранічны алкагалізм, якія здзейснілі тры ці болей правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення. Вось чаму важна, каб сваякі не пакідалі без увагі міліцыі ніводнай сямейнай драмы. Чым больш разоў «засвяціўся» скандаліст, тым больш сур'ёзным будзе пакаранне.

**Замоўчваннем усё толькі ўскладняецца. Калі не будуць прынятыя меры, у парушальніка ўзнікне пачуццё беспакаранасці і ўсёдазволенасці.**

У адносінах да сямейных тыранаў прымаюцца і абаронныя прадпісанні — гэта такая мера індывідуальнай прафілактыкі, калі правапарушальніку ўстанаўліваецца шэраг абмежаванняў, напрыклад, ён павінен пакінуць сумеснае месцапражыванне з ахвярай гвалту. Чалавек, які парушае тыя абмежаванні, прыцягваецца да адказнасці, аж да адміністрацыйнага арышту. Як паказвае практыка, абароннае прадпісанне дае добрыя вынікі. Ва ўсякім разе, хоць некаторы час пажылыя людзі пажывуць спакойна (правапарушальніка можна адсяліць максімум на 30 сутак).

— Вядома, адміністрацыйныя ці крымінальныя справы могуць распачынацца толькі па заяве пацярпелага, — кажа Марыя Жолабава. — Але калі мы выяўляем, што дарослы сын, сістэматычна збівае старую маці, якая знаходзіцца ў залежным стане ад крыўдзіцеля (не можа сама сябе абслугоўваць, напрыклад), то нават без яе згоды па фактах праз пракурора маем права завесці крымінальныя справы па такіх артыкулах, як катаванне, пагроза забойства і іншых.

Часам сямейныя скандалісты мяняюць свае адносіны, калі разумеюць, што на іх знайшлася ўправа.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** dziadziula@zviazda.by

# Жыць разам з бацькамі: «за» і «супраць»




**Самастойнасць і незалежнасць ці штодзённыя пошукі кампрамісаў і «войны на кухні»? Што і чаму выбіраюць маладыя (і не вельмі) сямейныя пары, вырашаючы, будуць яны жыць у адным доме з бацькамі ці асобна? Карэспандэнт «Звязды» звярнулася да некалькіх чалавек, якія падзяліліся сваімі гісторыямі.**



### ЗА. З прыцэлам на будучыню і спадчыну

**Крысціна:**

— Жывём разам з бацькамі мужа, будуем дом недалёка ад сталіцы, у яго ўкладваем усе сродкі. Кватрплата папалам з бацькамі, харчуемся асобна, грошай ад іх не бяром, сяброў да сябе не запрашаем, 2-гадовага сына на іх не пакідаем. Як збудуем дом, будзем думаць, перазняўшы у яго жыць ці прадаваць, каб набыць кватэру.

**Тацццяна:**

— У свекрыві трохпакаёўка, у маіх бацькоў — таксама. У нас з мужам двое дзяцей. Навошта нам нешта выдумляць і напружвацца? Пакуль пажывём з бацькамі, а ў свой час у нас будзе ўласнае жыллё, і ў дачок таксама.

### ЗА. Не рваць апошнія жылы

**Святлана:**

— Мне шкада аддаваць штомесяц грошы нейкай цёці Валі за паўгалодную свабоду ў двушцы без ніякіх перспектыў — лепш я іх аддам маці. Наша сям'я цудоўна жыве з ёй. Яна вельмі дапамагае з дзецьмі. Мы зрабілі нятанны рамонт, ездзім у адпачынак. Адкладваем грошы вельмі марудна, але ж я адчуваю, што жыву, а не рву апошнія жылы. Думаю, лепш нашу цяперашнюю «двушку» з часам пераўтварыць у трохпакаёўку. Бацькоў жа ў старасці даглядаць трэба будзе, а ў адной кватэры гэта больш зручна.

**Вераніка:**

— Упэўнена, калі супадаюць характары, то можна жыць душа ў душу. Я вельмі люблю сваю свякроў і часам жартую, што мне з ёй пашанцавала больш, чым з маці. Разам жывём ужо чатыры гады. Не збіраем грошы і не будуем нічога, бо будзем 100 гадоў гэта рабіць. Матэрыяльна мы не пакутуем, разам купляем прадукты і гатуем, штогод ездзім на мора, бо дзецям гэта абавязкова патрэбна. Быў час, калі жылі на мае падпрацоўкі і зарплату мужа, а было і так, што свякроў нас падтрымлівала, як я толькі ў дэкрэт пайшла. Цяпер, калі яна з'язджае на лецішча, каб даць нам пабыць асобнай сям'ёй, мы праз пару дзён едзем следам. А аднойчы паехалі на мора без свякрові, дык кожныя два дні тэлефанавала, пыталася, як мы там. Я таксама вельмі сумавала, нават смак кавы не такі быў, як калі з ёй п'еш.

### СУПРАЦЬ. Або ён, або я

**Жэня:**

— Мая матуля не пускала нас з мужам жыць асобна — пагражала, што прадасць кватэру і пакіне мяне з пустымі рукамі, калі мы з'едзем ад яе. Нават патрабавала выбраць паміж ёй і мужам і разысціся з ім, як яна гэта зрабіла з маім бацькам. І амаль дамаглася свайго, але, на шчасце, муж своечасова забраў нас з дачкой.

**Іван:**

— Мы вытрывалі побач з маёй маці роўна год. Як толькі з'ехалі — я зразумеў, што такое сапраўднае сямейнае жыццё. Цяжкасці нават згуртавалі нас з жонкай. Працавалі мы шмат, бралі ўсе магчымыя падпрацоўкі. З малой сядзелі па чарзе. Я працаваў у дзве змены. Надзя знаходзіла спосабы зарабляць аддалена. А маці яшчэ і частку кватрплаты прымушала плаціць за трохпакаёўку, бо гэта ж мне з сястрой у спадчыну будзе. А мы тады крэдыты выплачвалі, бо сваё жыллё пачалі будаваць. Як справіліся, не ведаю. Але ж калі бачу, чаго мы дасягнулі, разумею, што гэта таго каштавала.

### СУПРАЦЬ. Шанаваць, а не замінаць

**Аляксей:**

— Жыць з бацькамі вельмі цудоўна: і матэрыяльна лягчэй, і за малымі ёсць каму паглядзець, але гэтая казка не падыходзіць тым, хто з яе вырас. Ні адзін мужчына, які сябе паважае, не прывядзе жонку жыць у бацькоўскі дом, дзе ні ён, ні яна не будуць паўнавартаснымі гаспадарамі. А пайсці ў дом да бацькоў жонкі — гэта ўвогуле апошні варыянт.

**Ларыса:**

— Мне сорамна, што мы сядзім на шыі ў маіх бацькоў. І справа не ў грашах, а ў тым, што ім хочацца адпачыць пасля рабочага дня, пасядзець у цішыні. А яны прыходзяць дахаты, а тут унукі са сваімі свавольствамі. Хто сказаў, што ім падабаецца гэты сямейны інтэрнат? Калі бацькі старыя, я разумею — трэба жыць разам, каб даглядаць, а калі не — то сумеснае жыццё загадзя псуе адносіны. Маёй бабулі прывозілі на лета ў вёску чатырох унукаў, і ўсе лічылі, што гэта нармальна, ніхто не думаў, як яна з гэтым спраўляецца. А хіба магчыма нармальнае асабістае жыццё, калі бацькі за сценкай?.. Бацькоў трэба паважаць і шанаваць, але пакуль яны ў сіле — жыць асобна ад іх.

**Ірына СІДАРОК.** sidarok@zviazda.by

**Вольга ХВЯЖЭНКА, псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера:**

— Чыста па-чалавечы кожны круціцца, зыходзячы са сваіх магчымасцяў і прыярытэтаў. Адзін можа дазволіць сабе выбар, а другі павінен проста выжыць пры нястачы фінансаў, часу і сіл. Дапамога звычайна не бывае лішняй, у гэтым бацькі — незамянімыя. Але здараецца, што такая дапамога абыходзіцца даражэй, чым яе адсутнасць.

Асобнае пражыванне дапамагае станавіцца дарослым. Свой вопыт пераадолення цяжкасцяў дазваляе стаць больш моцным і ўпэўненым, яднае маладую сям'ю, бо яны разам справіліся з праблемамі і перамаглі іх. Сям'я фарміруе сваю непаўторную гісторыю. Маладыя людзі самі робяць свой агульны выбар кожны дзень і адказваюць за яго. І потым няма на каго перакінуць адказнасць. Гэта садзейнічае атрыманню самастойнасці, сталенню, адчуванню, што яны ўжо асобная сям'я.

Знаходжанне ў адной прасторы мае свае нюансы — узаемны ўплыў дамачадцаў розных адценняў, настрой, звычкі, індывідуальны ўклад быту. Умяшанне ў асабістае жыццё і прастору непазбежнае, а маладая сям'я — вельмі крохкае стварэнне. Гэта свет дваіх: мужчыны і жанчыны, якія для бацькоў застаюцца дзецьмі. І змешванне роляў нябачна можа нашкодзіць трапяткому саюзу.

# Вывучыцца на лагіста...

## НАСТАЎНІЦТВА — НЕ ЎСЫНАЎЛЕННЕ

— У разумных кніжках пішуць, што ёсць закон выходнага і ўваходнага патоку — тое, што мы даём гэтаму свету, у любым выпадку да нас вяртаецца, — тлумачыць Андрэй, калі пытаюся, навошта яму валанцёрства. — І ў мяне з'явілася думка, чаму б свой час не ўкласці ў іншага чалавека, якому гэта сапраўды патрэбна. Недзе выпадкова прачытаў пра праект настаўніцтва. Зразумеў, што нічога звышскладанага ў гэтым няма, а карысць можа быць сапраўды вялікая для выхаванца інтэрната. Ну і для мяне таксама.

Андрэю 26. Дзве адукацыі: будаўнік і эканаміст-менеджар. Але ні першую, ні другую не выкарыстоўвае. Трэці год хлопец займаецца прадпрымальніцтвам. Цяпер развівае адзін беларускі стартап.

Пра тое, што Андрэй — настаўнік, з яго знаёмых мала хто ведае. Расказаў толькі прыяцелям, якія маглі б паўдзельнічаць, і бацькам — тыя адчулі вялікі гонар за сына.

Перш чым стаць ментарам для выхаванца дзіцячага дома, Андрэй праходзіў трэнінг (яго праводзіць арганізацыя «Ніткі сяброўства», яна ж і рэалізуе праграму настаўніцтва). Адбор строгі. Да настаўніцтва ў выніку дапускаюць адносна невялікі працэнт з ліку ахвотнікаў.

**«Мы з бацькамі падтрымліваем зносіны. Я званю, прыязджаю да іх... Ды ў нас сям'я нармальная, проста атрымалася так».**

— Шмат людзей самі адсейваюцца на першапачатковым этапе, калі проста прыходзяць даведацца пра праект. У іх складваецца ўражанне, што настаўніцтва — гэта амаль усынаўленне. Таму баяцца браць на сябе такую адказнасць, — дзеліцца назіраннямі малады прадпрымальнік. — Яшчэ частка не праходзіць гутарку з псіхолагам, з розных прычын. Мой таварыш з жонкай, напрыклад, вельмі хацелі гэтым займацца, але так атрымалася, што яны самі дзіця чакаюць, і ім арганізатары настойліва парэкамендавалі пакуль не ўдзельнічаць.

Вопыт валанцёрства, дарэчы, у хлопца ўжо быў. Ён часам ездзіў з прыяцелямі ў дзіцячыя дамы з дабрачыннымі акцыямі. Разважае, што канцэрты, матэрыяльная дапамога падарункамі і грошы інтэрнатам патрэбны, але наколькі гэта застанецца ў памяці падлеткаў і пойдзе ім на карысць у далейшым — вялікае пытанне.

— Самае галоўнае, чаго не хапае гэтым дзецям, — здаровых зносін. Роля, якую выконвае праграма настаўніцтва, больш важная, чым проста сабрацца канторай і прывезці апельсінаў. Гэта мае асабістае перакананне.

Да чаго мусіць быць гатовы настаўнік? Напэўна, самае складанае, — задумваецца Андрэй, — не навязваць свае ідэалы і перакананні. Не спрабаваць чалавека выхаваць. Гэта ўжо сфарміраваная асоба, і трэба працаваць па запыце, даваць тое, што рэальна патрэбна дзіцяці.



Руслан СУСЛАЎ (злева) вучыцца на лагіста і хацеў бы стаць прадпрымальнікам. Як Андрэй.

Фота Надзеі БУЖАН.

## БЕЗ «ВЫШКІ» — МАКСІМУМ СТАРШЫ ГРУЗЧЫК

Працэс прыціркі ў хлопцаў прайшоў спакойна. Андрэй упэўнены: інакш і быць не магло. Пры састаўленні пар улічваюць пажаданні і настаўніка, і выхаванца. У іх супала ўсё: інтарэсы (абодва вядуць актыўны лад жыцця), характары.

Андрэй дапамагаў падлетку ў вучобе. Падказаў, якую прафесію выбраць, — Руслан цяпер вучыцца на лагіста. Астатнія хлопцы з інтэрната таксама паступілі ў каледжы — на аўтаслесараў і абліцоўшчыкаў-плітачнікаў. Бал атэстата быў невысокі, таму выбіраць асабліва не прыходзілася.



Настаўнік на падстрахоўцы — і на картынгу, і ў жыцці.

**«Самае галоўнае, чаго не хапае гэтым дзецям, — здаровых зносін. Роля, якую выконвае праграма настаўніцтва, больш важная, чым проста сабрацца канторай і прывезці апельсінаў».**

— Больш за палову з іх не ходзіць на заняткі, — прызнаецца Руслан. — Сказалі: «На першым курсе няма чаго рабіць».

***— А ты чаму не прагульваеш, як усе?***

— Я паступаў, каб атрымаць веды. У мяне ўжо прадметы спецыялізаваныя пачаліся, справаводства, напрыклад, дзе вучаць, як дакументы складаць. Мне гэта спатрэбіцца. І грошы мне каледж плаціць за тое, што хаджу на заняткі. Шэсць рублёў у дзень. У месяц 120 рублёў стыпендыі атрымліваецца. Маім сябрам, праўда, па 250 даюць, хоць яны на будаўнікоў вучацца і прагульваюць...

Універсітэт у планах падлетка таксама значыцца. Бо калі не пойдзе на «вышку», максімум, на што зможа разлічваць, — месца старшага грузчыка. А такая работа хлопца не асабліва прываблівае.

Паралельна Руслан вучыцца думаць, як прадпрымальнік. У адной з кніг, якія раіў яму Андрэй, вычытаў, што, каб сабраць грошы на мару, трэба ад свайго прыбытку, любога, толькі 10 працэнтаў пакідаць на асабістыя расходы. Таму амаль усю стыпендыю новаспечаны студэнт адкладвае, стараецца траціцца толькі на ежу.

— Цяпер Руслан папрасіў знайсці яму падпрацоўку, хоць якую. Балазе, не баіцца працаваць, — расказвае Андрэй. — Гэта тое, чым я магу дапамагчы, і не будзе паднашэннем: прыйшоў і грошай даў. Ён сваёй працай будзе зарабляць.

## ЖЫЦЬ ПА-ІНШАМУ

Стэрэатыпаў у адносінах да дзетдомаўцаў хапае.

***— Думаеш, інтэрнатаўскія дзеці адрозніваюцца ад астатніх?*** — пытанне Руслану.

— Калі жывеш з бацькамі, можаш вырасці мамчыным сынком. А тут чалавек больш самастойны, ён за сябе сам адказвае, — разважае падлетак.

— Мы на курсах чулі іншае меркаванне, — далучаецца Андрэй. — Пра тое, што дзеці, якія правялі шмат часу ў інтэрнаце, увогуле ніяк не прыстасаваны да самастойнага жыцця. Бо ў дзіцячым доме за іх усё робяць. І часта ёсць прыклады, калі падлеткі ў 16—18 гадоў не могуць прыгатаваць сабе паесці. Нас рыхтавалі да таго, што будзе патрэбна велізарная дапамога ў сацыялізацыі. Але мне з Русланам, відаць, пашанцавала.

**Статыстыка малюе выхаванцам інтэрнатаў не вельмі прывабныя перспектывы. Усяго адзін працэнт з іх атрымае вышэйшую адукацыю. Свае сем'і створыць толькі шостая частка дзетдомаўцаў. Палова пападзецца на злачынствах. У чым справа?**

— Няма дарослага чалавека, які цябе направіць у патрэбны кірунак, — спрабуе знайсці адказ Руслан.

— Чаму сіроты трапляюць у месцы пазбаўлення волі і не ствараюць сем'і? Таму што не ўмеюць жыць неяк па-іншаму, — працягвае Андрэй. — Ідуць па шляху найменшага супраціўлення: дзесьці схітрыць, украсці. Вось і атрымліваецца тое, што ёсць.

У Руслана ёсць надзейная падтрымка, таму за сваю будучыню ён не перажывае.

— Я хацеў бы, вядома, сям'ю, дзяцей. Сына. Але спяшацца няма куды. Спачатку трэба выбраць добрую дзяўчыну. І ўвогуле стаць заможным чалавекам, каб сям'ю забяспечваць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

■ Калі няма з кім пакінуць малечу

# ХВІЛІНКА ДЛЯ МАМЫ

### Новая паслуга з'явілася ў сталічным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання

**Раней, калі трэба было адлучыцца па сваіх справах на некалькі гадзін, Кацярына Шаўко пакідала 6-гадовага сына Мішу са сваякамі ці знаёмымі. Цяпер жа, каб не абцяжарваць блізкіх, 30-гадовая матуля плануе прыводзіць малога ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Кастрычніцкага раёна.**

«Пра «Хвілінку для мамы» я прачытала ў газеце, — расказвае Кацярына. — Дзіця пакідала ў цэнтры пакуль што толькі адзін раз: Мішка знаходзіўся там каля трох гадзін. Расказаў, што разам з добрай цёцяй гартаў кніжкі, гуляў у «лега», глядзеў мультфільм. Яму вельмі спадабалася, пытае, калі зноў пойдзем. Я засталася вельмі задаволеная. Калі не будзе з кім пакінуць дзіця, абавязкова зноў звярнуся па дапамогу да супрацоўнікаў цэнтра».

Ідэя «Хвілінкі для мамы» належыць псіхолагу цэнтра Вользе Зуевай: «Я лічу, што малы не павінен заставацца без нагляду. У апошні час здараецца безліч выпадкаў дзіцячага траўматызму: то вывальваюцца з вокнаў, то глытаюць манеты. Сутнасць новай паслугі ў некалькіх гадзінах вольнага часу для матулі. Ёй трэба выканаць за дзень шмат розных абавязкаў. Згадзіцеся, ісці ў краму з дзіцем не вельмі зручна. У паліклініку браць малога таксама не варыянт: не хочацца, каб ён нахапаўся інфекцыі».

Новай паслугай ужо скарысталіся больш як 10 чалавек. Прычыны розныя: камусьці трэба на аднаўленчыя працэдуры пасля аперацыі, хтосьці спяшаецца закрыць сесію ў інстытуце, іншыя вядуць старэйшых дзетак у паліклініку ці працуюць у гнуткім рэжыме і маюць патрэбу адлучыцца. «Да нас звяртаюцца не так званыя «гультаяватыя матулі», а жанчыны, якія насамрэч вымушаны пакінуць дзіця на некаторы час у бяспецы і пад наглядам, — працягвае Вольга. — У сярэднім за тыдзень два звароты. Ужо былі і пастаянныя кліенты: двух дзетак пакідалі рэгулярна. Аднаго — з-за работы, другога — па прычыне рэабілітацыі матулі пасля захворвання».

Гульнявы пакой, дзе пакідаюць дзетак, хоць і невялікі, але даволі ўтульны і па-дамашняму абсталяваны. Светла-ружовыя сцены і мяккі дыван, адсутнасць вострых вуглоў і небяспечных прадметаў, мноства разнастайных цацак... Увесь час, на які пакінулі дзіця, спецыяліст неадлучна займаецца малым — робіць усё магчымае, каб яму было камфортна і спакойна.

**«Згадзіцеся, ісці ў краму з дзіцем не вельмі зручна. У паліклініку браць малога таксама не варыянт: не хочацца, каб ён нахапаўся інфекцыі».**

— У цэнтр прыводзяць дзетак розных узростаў — ад 6 месяцаў да 6-7 гадоў. З самымі маленькімі застаюся я, таму што ў мяне ўжо ёсць вопыт: я сама — маці. Матулі імкнуцца падстроіцца так, каб малы быў накормлены і каб у яго быў сухі памперс. Тады яны найчасцей прывозяць яго на сон. Мая калега, таксама псіхолаг, займаецца са старэйшымі дзеткамі. Яны будуюць «ваенныя базы», гуляюць у цырк, спрабуюць розныя ролевыя гульні. Для маленькіх у нас ёсць пальчыкавыя гульні, мяккі бяспечны канструктар. Старэйшыя забаўляюцца з канструктарам «Лега». Яшчэ дзецям вельмі падабаецца маляваць манкай: яны робяць розныя ўзоры, варушаць паднос — і зноў атрымліваюць чыстае палатно. Таксама пішам лічбы, літары, гуляем з дзіцячым посудам і бальнічкамі.

Скарыстацца «Хвілінкай для мамы» можна па адрасе: вул. Ляўкова, 19 у Мінску з 08.00 да 20.00 (субота, нядзеля — выхадныя). Дарэчы, прывесці малога ў цэнтр можа не толькі матуля, але і тата або іншыя сваякі. На месцы патрэбна прадставіць пашпарт і падпісаць дагавор па аказанні паслугі. Псіхолагі гатовыя прыняць дзіця не больш чым на чатыры гадзіны (адна — каштуе 3 рублі 33 капейкі). Няма за такія грошы знайсці ў сталіцы немагчыма, тым больш яна, як правіла, згаджаецца працаваць толькі поўны дзень. Калі матуля затрымліваецца, супрацоўнікі цэнтра ідуць насустрач і працягваюць займацца дзіцем — пры ўмове далейшай даплаты. Дзяцей прывозяць з розных раёнаў Мінска, спецыялісты не выключаюць магчымасці прыняць на некалькі гадзін іншагародніх пры неабходнасці. Як паказала практыка, попыт у новай паслугі ёсць, праўда, пра яе не ўсе яшчэ ведаюць. Магчыма, іншыя гарадскія цэнтры сацыяльнага абслугоўвання падтрымаюць эстафету і таксама прапануюць карысную для бацькоў паслугу.

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.** *veronika.ulasevich@mail.ru*

■

# ДЗІЦЯЧЫ САДОК МАРЫ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ»)*

***— Як нарадзілася ідэя стварыць экасадок?***

— З нараджэннем сына (яму цяпер 4 гады) маё жыццё істотна змянілася *(смяецца)*. Год таму мы з дзвюма дзяўчатамі стварылі ў Гродне нешта накшталт Дзіцячых экамайстэрняў, якія ёсць у Мінску. У гэтым вельмі дапамаглі таварыства «Зялёная сетка» і Цэнтр экалагічных рашэнняў. Так на валанцёрскіх пачатках і ўзнікла Дзіцячая экастудыя. У фармаце майстар-класаў адзін раз на тыдзень мы расказвалі дзецям ад 5 гадоў і іх бацькам, як быць экадружалюбнымі. Гэта было весела і інтэрактыўна: прыносілі грунт і чарвякоў, паказвалі, як рабіць кампост; ладзілі мадэль кругазвароту вады ў прыродзе і раставання леднікоў; сартавалі пластыкавыя бутэлькі ў адпаведнасці з лічбамі на іх... Так працягвалася тры месяцы — гэта ўсё былі некамерцыйныя заняткі, якія фінансаваліся міжнародным праектам. А калі праект скончыўся, мы былі пакінуты самі сабе...

Менавіта тады лёс мяне звёў з цудоўнай мамай траіх дзетак Таняй Валошчык, яна педагог-псіхолаг па адукацыі, — і сярод іншых ідэй у нас нарадзілася задумка стварыць уласны экасадок (дакладней — групу няпоўнага дня, да 4 гадзін). На сёння гэта галоўны праект нашай Дзіцячай экастудыі. Міні-садок працуе раніцамі, а ў астатні час праходзяць іншыя заняткі, якія вучаць дзяцей у тым ліку любіць і берагчы прыроду. Я бачу, што маладыя бацькі вельмі натхнёныя, ім блізка тое, чым мы займаемся. Мне неяк нават напісала адна мама з Мінска з пытаннем, ці не ведаем мы, мо ёсць у яе горадзе нешта такое. Расказала пра гэта сваім знаёмым. Дык яны натхніліся нашым вопытам і хочуць штосьці падобнае зрабіць у сталіцы.

***— Раскажы пра методыкі і цацкі, якія вы выкарыстоўваеце.***

— Асноўная наша методыка — гульня, праз якую адбываецца навучанне. Гульня — гэта самы даступны дзецям спосаб падачы інфармацыі. У нас даволі шмат цікавых дапаможнікаў (якія развіваюць маторыку, мысленне і г.д.), у тым ліку арыгінальных: драўляныя блокі, мяшэчкі з рознымі напаўняльнікамі (крупы, пясок, сінтэпон), сэнсарныя скрынкі з прыроднымі матэрыяламі (каштаны, жалуды, камяні), канструктар са спілаў дрэва (дрэва, якое ўпала, зразумела), вялікі драўляны домік для лялечных гульняў... І шмат чаго яшчэ. Усё гэта мы рыхтавалі на працягу некалькіх месяцаў: шылі, майстравалі, заказвалі. У нашым садку няма пластыкавых цацак — толькі экалагічныя. І ўсе яны чамусьці вучаць, а не проста забаўляюць.

Мы з Таняй прыхільніцы індывідуальнага падыходу ў развіцці дзіцяці. У Еўропе ёсць Вальдорфскія дзіцячыя сады. Многія рэчы пазычаем адтуль. У аснову метаду вальдорфскай педагогікі закладзена выхаванне дзеяннямі і практыкай, а не словамі і тэорыяй. Дзіця да 7 гадоў з'яўляецца пераймальнікам, бярэ прыклад з бацькоў і выхавальнікаў, таму дарослыя павінны паказваць толькі станоўчыя прыклады. Развіццё ж адбываецца за кошт трэніроўкі дробнай маторыкі з дапамогай лепкі, рукадзелля. Вельмі шмат увагі ўдзяляем назіранням за зменамі ў прыродзе, рабоце з натуральнымі матэрыяламі: увосень, напрыклад, збіраем лісце, каштаны... Робім з іх не толькі сувеніры, але і выкарыстоўваем у гульні «Крама» ў якасці грошай.

***— Чаму вы аддалі перавагу экавыхаванню? У тваім дзяцінстве яно было?***

— У маім дзяцінстве, вядома, не было ніякага экавыхавання, ды і выхаваннем у прынцыпе мала хто займаўся. Бо тады было ўсё так сумна (дэфіцыт, талоны на ежу), і галоўнае пытанне, якое хвалявала: як пракарміць сям'ю. Сёння ж трывожныя мамы-інтраверты, накшталт мяне, даволі моцна арыентаваны на гарманічнае развіццё дзіцяці. Магчыма, гэта такая кампенсацыя за сваё дзяцінства, дзе развіваючым цэнтрам быў двор. Ва ўсякім разе, такая мая гісторыя. Расла ў вёсцы, да садзіка было далёка, вадзіць не было каму, і я была пакінута сама сабе і жыла ў сваім свеце: там былі парцалянавыя фігуркі з бабулінай шафы, сябар Лёша, вялікая сасна, электрычка ў Друскенікі... Мне было там добра. Але цяпер разумею, што калі б дзяўчынкай мяне адправілі ў «Ветку» — гэта была б наогул мара. Я вырасла б, напэўна, іншым чалавекам. Гэта кажу пра выхаванне ў прынцыпе. Экавыхаванне ж цяпер актуальнае таму, што мы, здаецца, дасягнулі нейкага дна ў адносінах з планетай, і яна ўжо паволі плаціць нам той жа манетай: брудное паветра і дрэннае харчаванне правакуюць цяжкія і небяспечныя захворванні ў дзяцей. Я думаю, што, вядома, мы вельмі позна спахапіліся з экавыхаваннем. Але лепш позна, чым ніколі.

***— Як вашыя сям'і ставяцца да справы, якой вы займаецеся?***

— Мой муж Яўген — гэта вялікая дапамога і наш талісман. Без яго мы б не змаглі. Жэня калісьці захапляўся арніталогіяй, а па адукацыі ён настаўнік хіміі і біялогіі. Але акрамя гэтага таленту ў яго ёсць добрыя рукі, якія заўсёды гатовыя дапамагчы. Ён шмат чаго майструе нам для экасадка. Таніна сям'я таксама вельмі экадружалюбная. Мы супадаем па поглядах і каштоўнасцях.

***— Якія парады датычна экавыхавання ты можаш даць бацькам, што не маюць магчымасці прыводзіць дзетак у ваш садок, бо жывуць не ў Гродне?***

— Думаю, можна пачаць нават не столькі з экавыхавання, колькі з прывучвання да самастойнасці. Прасіць дзіця дапамагчы ў простых хатніх справах: паліванні кветак, выціранні пылу, раскладванні рэчаў і цацак па месцах, мыццю посуду і г.д. Мы ў «Ветцы» так усё і робім — разам. Паступова выпрацоўваецца адказнасць за свае дзеянні. На самай справе адказнасць — гэта тое, чаго нам не хапае ў адносінах да планеты.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


У «Ветцы» кожная пара года — чаканая.


Тэатральныя заняткі не толькі развіваюць фантазію, але і разнявольваюць малых.


Цацкі... пад нагамі.


Гульня «Крама»: гародніна з фетру, а замест грошай — каштаны.


У міні-садку няма бессэнсоўных цацак: кожная чамусьці вучыць.

## Ежа расце... з халадзільніка

Пра тое, што сучасныя гарадскія дзеці не ўяўляюць, адкуль бярэцца ежа, казала Рыма Ушкевіч. Гэтую ж думку пачула я нядаўна і ў Кіеве падчас наведвання інавацыйнай адукацыйнай прасторы для дзяцей «Арсенал ідэй» (месціцца ў сценах музейнага комплексу «Мастацкі арсенал»).

«На днях ладзілі для групы дзетак інтэрактыўную лекцыю пра здаровае харчаванне, — расказвае **Святлана ЦУРКАН, супрацоўніца «Мастацкага арсенала»**. — Дык 80% малых на пытанне «адкуль бярэцца капуста, пятрушка?» адказалі, што з халадзільніка (ці з крамы). Мы адразу ж завялі іх у экалабараторыю і з дапамогай дакумент-камеры паказалі, як прарастае тое ці іншае насенне».

Акрамя дакумент-камеры, у экалабараторыі шмат розных цікавых мультымедыйных тэхналогій. У прыватнасці, цяпліца, вільготнасць у якой можна кантраляваць з дапамогай праграмы на тэлефоне. Мастацкае пано з сакрэтнымі адтулінамі, дзе можна знайсці цікавыя і малавядомыя факты пра жывёл. Інтэрактыўны домік для пчол, побач з якім розныя віды мёду, пярга... «У нас нават мурашыная ферма ёсць, — паказвае Святлана. — Дзеці вельмі любяць назіраць за жыццём мурашоў: чым тыя харчуюцца, дзе бяруць ваду».

«Нас вельмі радуе, што многія сем'і ўзялі за традыцыю ў суботу або нядзелю пасля сняданку разам з дзецьмі і сябрамі хадзіць у наш музей, дзе можна не толькі ўбачыць новую мастацкую выстаўку, але і даведацца шмат новага пра навакольны свет і, вядома ж, пра саміх сябе, — кажа **Вольга ВІЕРА, арганізатар адукацыйнага праекта для дзяцей «Арсенал ідэй»**. — Тут хлопчыкі і дзяўчаткі працуюць разам з дарослымі — як з валанцёрамі і супрацоўнікамі, так і з бацькамі. Гэты прынцып, які не дае магчымасці мамам і татам пакінуць дзяцей і заняцца сваімі справамі, надзвычай важны, паколькі стымулюе да сумеснага, цікавага і пазнавальнага баўлення вольнага часу і нават — да маленькіх, але вельмі карысных адкрыццяў (бо пры такіх сумесных пошуках бацькі нярэдка адкрываюць у сваіх дзецях цалкам новыя таленты і захапленні).

У «Арсенале» сям'я можа правесці цэлы дзень. Дзецям да 12 гадоў уваход бясплатны. Білет для дарослых каштуе 80 грыўняў (каля 6 беларускіх рублёў). Будзеце ў Кіеве — абавязкова завітайце!

## Лецішча не трэба

Хачу падзяліцца і яшчэ адной ідэяй, падгледжанай у Кіеве. Магчыма, хтосьці з мінскіх мам і татаў натхніцца і таксама зробіць штосьці падобнае?

У розных раёнах Кіева набываюць папулярнасць гарадскія міні-сады і агародзікі. Тыя, у каго няма дачы, сталі вырошчваць садавіну і агародніну ў драўляных скрынях на балконах, дахах, у дварах побач са шматкватэрнымі дамамі. «Я таксама натхніўся і вырашыў зладзіць на сваім балконе міні-агародзік, — кажа **Тарас КАЙДАН, адзін са стваральнікаў кіеўскага гарадскога часопіса «Хмарачос»**. — Лічу, што грамадскі сад — гэта карыснае гарадское хобі, у тым ліку і для дзяцей. Не ўсе хлопчыкі і дзяўчаткі могуць ездзіць летам на дачу да бабулі. А вось некалькі скрыначак або градак з раслінамі на балконе ці побач са шматкватэрным домам — гэта добры наглядны дапаможнік, каб паказаць «дзецям асфальту», як расце пятрушка або, напрыклад, пекінская капуста. Калі гэта фруктовы сад, то можна разам з мамай ці татам дагледзець дрэвы і радавацца пладам летам і восенню. Акрамя таго, дзеці могуць гуляць там пад наглядам аднаго з бацькоў».

А натхніў кіяўлян на ўласныя міні-агародзікі грамадскі агарод, які не так даўно з'явіўся ў цэнтры Кіева на тэрыторыі адукацыйнай станцыі 31B1. Там на тэрасе і на «зялёным» даху вырошчваюць таматы, агуркі, фасолю, балгарскі перац, буякі, лясныя і садовыя суніцы, гарчыцу, базілік, рукалу, кінзу і многія іншыя духмяныя травы і агародніну. Праект стартаваў на платформе «Вялікая ідэя» (ініцыятыва па стварэнні агарода сабрала каля 79 000 грыўняў пры неабходных 75 000).

Пачалося ж усё тры гады таму, калі Аляксандр Супрунец, адзін з сузаснавальнікаў грамадскага агарода, вырасціў сад на сваім балконе. «У мяне ёсць вялікі незашклёны балкон, які закрываюць ад урбанізацыі тры вялізныя прыгожыя бярозы, — расказвае Аляксандр. — Улетку ён — яшчэ і міні-кавярня для сяброў. Ідэя вырасціць сад на сваім балконе з'явілася невыпадкова: я захапляюся вырошчваннем раслін з дзяцінства. Шмат эксперыментаваў, каб гарманічна дапоўніць прастору, а не бяздумна запоўніць раслінамі. Пасля трох гадоў «балконнага фермерства» ў мяне з'явілася жаданне працягнуць справу на большым участку».

Сёння на грамадскі агарод можна прыйсці не толькі, каб купіць расаду ды якасныя біяпрэпараты, але і ўсёй сям'ёй пачаць здаровы ранак з ёгі, экалагічнага сняданка і пазнавальнай лекцыі. «Вучым кіяўлян тонкасцям фермерства ў горадзе, — працягвае Аляксандр. — Наша мэта паказаць, што чалавек можа сам вырошчваць сабе здаровую экалагічную ежу. Калі сумясціць сучасныя тэхналогіі і старажытныя метады апрацоўкі зямлі, можна дамагчыся цікавага нечаканага выніку. На нашых лекцыях вы даведаецеся, напрыклад, як можна рабіць кампост з арганічных адходаў або як кожны з нас можа паўплываць на аднаўленне кліматычнага балансу».

А пакуль бацькі абменьваюцца насеннем і практыкамі вырошчвання здаровай ежы, прафесійныя эколагі і педагогі раскажуць дзецям у гульнявой форме пра важнасць беражлівага стаўлення да прыроды, правядуць цікавыя майстар-класы.

■ Добрая справа

# ШКАРПЭТКІ АД БАБУЛІ

**Мінчанка запусціла сайт, які дазволіць вязальшчыцам прадаваць свае вырабы праз інтэрнэт, а не мерзнуць на вуліцы**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Бывае — бяжыш некуды, у галаве процьма спраў, адна важнейшая за другую, а ў пераходзе метро раптам бачыш адзінокую маленькую, крыху згорбленую бабулю. Яна беражліва трымае ў руках пару яркіх вязаных шкарпэтак у чорна-жоўтую палоску. І неяк так здараецца, што ўсе твае турботы і клопаты здаюцца маленькімі і нязначнымі і адыходзяць на другі план, бо на яе месцы магла б быць твая бабуля. «Колькі?» — пытаешся ты. «Колькі дасце», — адказвае яна. І вось ты ўжо крочыш дадому, каб аб'явіць вайну восеньскай хандры разам з гэтымі самымі «пчалінымі» шкарпэткамі. Пра некаторыя з такіх гісторый час ад часу пішуць у СМІ. Памятаеце дзядулю, які прадаваў шпакоўні ў пераходзе станцыі метро «Плошча Якуба Коласа», альбо бабулю, што стаяла з вязанымі шкарпэткамі і рукавіцамі на Нямізе? Але колькі застаецца тых, пра каго ніхто ніколі не напіша...**


Аўтар праекта «Шкарпэткі ад бабулі» — Дзіяна Сівіцкая.

На стварэнне праекта «Шкарпэткі ад бабулі» Дзіяну Сівіцкую натхніла адна з такіх гісторый: каля ГУМа пажылая жанчына прадавала звязаныя ўручную сурвэткі. Але, як прызнаецца Дзіяна, гэтая ідэя далёка не новая: такія праекты ёсць у многіх краінах свету, у тым ліку ў Расіі і Украіне.

— Упэўнена: стварыць нешта падобнае ў Беларусі хацелі і да мяне. Проста так атрымалася, што агучыла ідэю менавіта я. Усё пачынаецца з таго, што ты не можаш прайсці міма, не разумееш, як гэта наогул магчыма. Спрабуеш нешта прыдумаць, вырашыць. Я пачала шукаць у інтэрнэце і знайшла расійскі сайт. Яны працуюць па вельмі сацыяльнай мадэлі: бабуля вяжа дзве пары шкарпэтак, адна з якіх ідзе ў якасці падарунка ў дом састарэлых, — расказвае дзяўчына.

Цяпер Дзіяна шукае пажылых жанчын, якія б маглі вязаць шкарпэткі на заказ, — менавіта ў гэтым і ёсць асноўная ідэя праекта.

— Шчыра кажучы, я не думала, што гэта будзе так складана — знайсці таленавітых вязальшчыц, якія б адносіліся да гэтага занятку адказна і разумелі, што вязаць для сваіх родных, напрыклад, унукаў — гэта адно, а рабіць рэч пад заказ — зусім іншае. Тут памылак быць не павінна (калі прапусцілі пятлю, трэба будзе ўсё ж такі вярнуцца да яе), і неабходна памятаць, што шкарпэткі вяжуцца менавіта тыя, якія хоча бачыць заказчык. Вельмі важна, каб для самой вязальшчыцы ўсё гэта было ў радасць. Тым, хто мне тэлефанаваў, я давала тэставае заданне. Папрасіла жанчын, якія хацелі далучыцца да праекта, звязаць пару шкарпэтак на свой густ, па сваёй ідэі. Здавалася б, што можа быць прасцей, бо ніякіх абмежаванняў няма? Я прасіла паназіраць за сабой у працэсе вязання: за колькі атрымліваецца звязаць пару шкарпэтак, ці камфортна рабіць гэта для чужога чалавека? Як ні дзіўна, менавіта на гэтым этапе большасць ахвотных сыходзіла.

Зусім нядаўна да праекта далучыліся пяць жанчын, самай малодшай з якіх — 59 гадоў. Адна з іх расказала, што да гэтага спрабавала прадаваць свае вырабы на рынку «Ждановічы». Шкарпэткі хвалілі, казалі, што вельмі прыгожыя, але чамусьці не куплялі.

**Цікава, што б мог звязаць дзядуля? Мабыць, гэта былі б шкарпэткі з танкамі — добры падарунак для кагосьці з мужчын да 23 лютага.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Дзіяна марыць, каб праект быў утульным і «хатнім».

Па словах Дзіяны Сівіцкай, каб праект захаваў сваё хатняе цяпло, у «Шкарпэтках» павінна быць максімум 10—12 бабуль.

— Задача не ў тым, каб апрануць у вязаныя шкарпэткі ўсю краіну, а каб праект быў невялікім і, менавіта таму, утульным, «хатнім».

Спачатку ў Дзіяны была ідэя прадаваць з дапамогай праекта розныя рэчы, але ў выніку сайт мог ператварыцца ў безасабовы каталог, дзе за вялікай колькасцю вырабаў не відаць людзей — майстрых праекта. Гэтага хацелася пазбегнуць.

— Даволі часта людзі пытаюцца: чаму менавіта шкарпэткі? Бо звязаць можна мноства прыгожых рэчаў, і мне ўжо прапаноўвалі дабавіць у праект рукавіцы і шапкі. Я выбрала менавіта шкарпэткі, бо яны асацыююцца з клопатам. Гэта ідзе з дзяцінства, калі хтосьці блізкі і родны клапаціўся пра тое, каб твае ножкі былі заўсёды ў цяпле.

Акрамя гэтага, як гаворыць Дзіяна, калі ў праекце раптам будуць не толькі бабулі, а яшчэ і дзядулі, гэта будзе вельмі цікава. Дарэчы, з ёю ўжо звязалася адна жанчына, чый тата пасля выхаду на пенсію пачаў вязаць.

— Ва ўсіх ёсць нейкая асацыяцыя вязання менавіта з бабуляй. Цікава, што б мог звязаць дзядуля? Мабыць, гэта былі б шкарпэткі з танкамі — добры падарунак для кагосьці з мужчын да 23 лютага.

Ужо зараз праект «Шкарпэткі ад бабулі» атрымаў водгук: хтосьці проста хваліць ідэю і радуецца таму, што такое можа быць рэалізавана ў нашай краіне, а хтосьці прапаноўвае ў вязальшчыцы кандыдатуры сваіх бабуль.

— Да нас далучыліся валанцёры, мы запусцілі сайт skarpetki.by. Плануецца, што ён будзе даступны ў англійскай і польскай версіях. Спадзяюся, што запуск «Шкарпэтак ад бабулі» дасць магчымасць рэалізоўваць і далей вось такія пачынанні — сумленныя і шчырыя. Хочацца даць магчымасць таленавітым людзям, якія знаходзяцца на пенсіі, атрымаць такую вось занятасць. Паказаць ім, што яны патрэбныя. Іх таленты — патрэбныя.

**Ганна БАГІНО**

■ Залатыя рукі

# Ці кожны зробіць табурэт?



**Кіраўнік сталярнай школы Дзмітрый Бахвалаў лічыць: зусім ужо бязрукіх, не здольных вырабіць хоць што-небудзь, не існуе. Былі б добрыя настаўнікі! Тут, у завулку Паўночным, 13, у Мінску, старое як свет майстэрства асвойваюць і жанчыны.**

Першая прыватная сталярная школа izDereva.by адкрылася ў сталіцы для ўсіх жадаючых. Праграма курса для ўсіх, хто пачынае, так і называецца — «Асновы сталярнай справы». Гэта 32 гадзіны, або 8 заняткаў цягам месяца. Некалькі груп па 7 чалавек ужо ўкамплектаваныя, прычым каля 35 працэнтаў ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ва ўзросце 22—64 гадоў, — гэта асобы прыгожага полу. Усіх чакае знаёмства з гісторыяй сталярнай справы, вывучэнне рознай драўніны і магчымасцяў яе прымянення, складанне эскіза... і да пакрыцця лакам і фарбай.

— Дрэваапрацоўкай некалі займаўся мой бацька, — расказвае Дзмітрый, якому днямі спаўняецца 34. — Было гэта, калі наша сям'я жыла ў Заходняй Сібіры. Бацька зведаў усю работу, звязаную з дрэвам, — ад нарыхтоўкі лесу да вырабу нейкіх рэчаў. Аднойчы мы вярнуліся, я скончыў у Мінску ВНУ (па адукацыі Дзмітрый — выкладчык іспанскай мовы). Аднак успаміны дзяцінства не адпускалі мяне ні на дзень. Час ад часу я што-небудзь рабіў сваімі рукамі, але гэтай вясной сказаў сабе «стоп»: жыццё не такое доўгае, каб займацца не тым, чым хочацца! Давялося пачаць з нуля — з рамонту ў гэтым памяшканні. Па старых чарцяжах і схемах аднавіў тое, чым займаўся бацька, і адкрыў спачатку грамадскую майстэрню, пачаў прымаць заказы на некалькі сталярных вырабаў. Сёння яны распісаныя на паўгода наперад. Але гэтага мне было мала. І вось я адкрыў школу для ўсіх ахвотных любога ўзросту. Можа быць, некаму гэта будзе карысна для таго, каб самому пачаць сталярны бізнес, а нехта будзе прыходзіць толькі дзеля пераключэння з мабільных прыстасаванняў і эмацыянальнага адпачынку. У межах курса — крыху тэорыі і выраб падстаўкі для мабільнага, скрыні для кветак і табурэта.




З драўнінай у нас працуюць або велізарныя прадпрыемствы, або адзіночкі штосьці пілуюць у гаражах. А мне вельмі хочацца сфарміраваць сярэдні клас сталярнай справы, укараніць школы-майстэрні — як гэта ёсць у іншых краінах. Я за здаровую канкурэнцыю, за тое, каб сталярных школ было больш. Няхай людзі збіраюцца, вырабляюць што-небудзь прыгожае і ўнікальнае для горада... Пакуль я назапашваю вопыт — вось толькі што месяц правёў у Маскве, на студзень запланаваў наведванне падобных школ у Вялікабрытаніі, пасля паеду ў Канаду. Хочацца пераймаць лепшы вопыт з усяго свету...

Дарэчы, жонка Дзмітрыя таксама ўмее і малаток, і стамеску трымаць правільна. Праўда, у яе — свая справа. Яна валодае сеткай гульнявых пакояў для дзяцей «Цёця-моця», дзе можна пакінуць дзіця на гадзіну-другую. У саміх жа Бахвалавых — трое дзяцей! Двойня (хлопчык-дзяўчынка) і яшчэ адзін сынок.

**Жыццё не такое доўгае, каб займацца не тым, чым хочацца!**

«Калі вы думаеце, што дома ў мяне ўсё выраблена маімі рукамі, і сябры ходзяць па кватэры як па музеі, то памыляецеся! — усміхаецца Дзмітрый. — Я шавец без ботаў. На жаль ці на шчасце, усе сілы затрачаны тут, але ніякага шкадавання ў мяне няма. Нават не разумею, як я мог жыць без гэтага. Тут мая душа, мой азарт».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2 |
| **Начальная цена продажи** | 40 951 р. (сорок тысяч девятьсот пятьдесят один рубль) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 095 р. (четыре тысячи девяносто пять рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 06 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 30 ноября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 7** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-79015 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание бытовки), площадью 128,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. Составные части и принадлежности: цементобетонное покрытие площадью 8, м кв., ограждение из металлической сетки, протяженностью 48,0 м |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000001006832, площадью 0,0325 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания бытовки), расположенный по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. |
| **Начальная цена продажи** | 32 000 р. (тридцать две тысячи рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 200 р. (три тысячи двести рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 06 декабря 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 30 ноября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 80%) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ОАО «СКИДЕЛЬСКИЙ САХАРНЫЙ КОМБИНАТ»

| | Лот №1 | | |
|---|---|---|---|
— Ідэя ўзнікла летам 2013 года, — расказвае Юлія Васілюк з Мінска. — Мы з Іванам тады былі жанатыя і ўжо дакладна ведалі, што на гадавіну будзем замаўляць фотасесію ў свайго вясельнага фатографа. Лазілі тады ў інтэрнэце, каб падгледзець ідэі для Love Story і натрапілі на незвычайныя здымкі пары з Амерыкі. У выніку хуценька раздрукавалі сваё вясельнае фота (рамачку з газеты для яго я рабіла сама) і ажыццявілі сваю задуму. Спачатку планавалі, што кожны год будзем фатаграфавацца менавіта 14 ліпеня, але ўжо налета ўсё праваронілі. Я толькі напрыканцы снежня звярнула ўвагу на тое, што фота мы не абнавілі. Таму тэрмінова ўзялі маю сяброўку і пабеглі фатаграфавацца каля ёлачкі ў гандлёвы цэнтр «Сталіца». У выніку фота раздрукавалі і павесілі на сцяну за некалькі гадзін да надыходу Новага года. У 2015-м мы бралі здымак з сабой у падарожжа. Плылі на пароме па маршруце Талін—Хельсінкі—Стакгольм і сфатаграфаваліся на палубе. Здымаў нас выпадковы спадарожнік — цудоўны дзядзечка фін. Сёлета мы хацелі, каб у кадр трапіла што-небудзь сімвалічнае. Таму ўзялі сяброўку і паехалі фатаграфавацца на фоне графіці на вуліцу Кастрычніцкую.

Усе мінулыя здымкі беражліва захоўваем. Спадзяюся, што, калі ў нас будуць унукі, мы зладзім выставу аднаго фотаздымка, дзе развесім усе-ўсе «фоткі з фоткамі».

## ІДЭЯ №2. ПРЫВІТАННЕ З МІНУЛАГА

Паглядзіце на гэтыя душэўныя здымкі. Хто ведае, можа, яны натхняць вас прагартаць свой сямейны альбом і надаць другое жыццё пажоўклым картачкам. Для ўвасаблення гэтай ідэі неабходна выбраць некалькі фотаздымкаў, напрыклад, на якіх вы яшчэ зусім дзіця, а вашы бацькі маладыя, і зрабіць свежыя, паўтарыўшы ўсё дакладна, як на старой картачцы: вопратку, асяроддзе, паставы і выраз твараў.





Фота: Voyage-voyage.

**Тата і сын праз 60 гадоў.**

**Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

## ІДЭЯ №3. РАДАВОЕ ДРЭВА

Знаёмая расказала, што яны ніяк не маглі сфатаграфавацца вялікай сям'ёй, каб зрабіць падарунак бабулі на юбілей. Таму вырашылі намаляваць на вялікім ватмане дрэва і наклеіць туды фотаздымкі ўсіх членаў сям'і, сфатаграфаваных паасобку. Аформілі ўсё гэта ў прыгожую рамку. Бабуля дагэтуль не нарадуецца такому падарунку.

Сямейнае дрэва можа стаць не толькі незвычайным падарункам, але і цудоўным інтэр'ерным рашэннем. Яго можна намаляваць на сцяне акрылавымі фарбамі або стварыць з астаткаў шпалераў, каляровай паперы. Самы ж просты варыянт: набыць вінілавую налепку ў выглядзе дрэва. Застаецца толькі выбраць месца на ім, дзе будзе вісець кожная фатаграфія блізкіх людзей у рамачцы, і ўбіць туды невялікія цвікі. Вядома, можна зрабіць сам працэс больш творчым, замяніўшы вінілавую налепку дрэва на сухую галінку. Толькі не забудзьцеся апрацаваць яе спецыяльным лакам. Цвікі ў гэтым выпадку можна замяніць на нітачкі, якія трэба прывязаць да фотаздымка.



Фота: iqinterior.ru

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАРТА ВЕДАЦЬ

## Правілы мыцця пухавікоў у пральнай машыне

**Шмат хто з нас носіць восенню і зімой пухавікі, бо гэта цёплая, зручная і практычная вопратка. Час ад часу пухавік трэба памыць. Паслугі хімчысткі каштуюць нятанна, таму, каб сэканоміць, гэта можна зрабіць дома. Але перш чым пакласці пухавік у пральную машыну, варта даведацца, як яго правільна мыць.**

**1.** Перад мыццём трэба зашпіліць маланку і гузікі. Зняць аздобы з футра. Вывернуць пухавік навыварат.

***ВАЖНА:*** калі ў пухавіка футра не здымаецца, то мыць такі экзэмпляр нельга. Па-першае: ёсць вялікая імавернасць таго, што яно зафарбуе сам пухавік, асабліва калі яны кантрастных колераў. Па-другое, футра пасля «лазневай працэдуры» хутчэй за ўсё стане жорсткім.

**2.** Мыць трэба толькі адзін пухавік без іншых рэчаў.

**3.** Выкарыстоўвайце толькі вадкі сродак для мыцця далікатных тканін. Ніякага парашку!

**4.** Выберыце самы ашчадны рэжым. Лепш за ўсё мыць пры 30 градусах. Палашчыце мінімум 3-4 разы.

**5.** Пасля мыцця пухавіка галоўнае, каб пух не збіўся ў камякі. Для гэтага пакладзіце ў пральную машынку 3-4 мячыкі для тэніса. Але спачатку іх таксама трэба памыць.

**6.** Сушыце пухавік на свежым паветры. Ні ў якім разе не рабіце гэта каля агню або прыбораў ацяплення!



**7.** Пухавік будзе сохнуць не адзін дзень. Перыядычна падыходзьце да яго і ператрасайце, каб расправіць пух.

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Самыя смачныя начынкі для блінцоў

**З яек.** ***Спатрэбіцца:*** *4 вараныя яйкі, 50 г зялёнай цыбулі, галінка кропу, соль.*

Цыбулю парэзаць і абсмажыць. Яйкі надзерці на буйной тарцы. Змяшаць цыбулю, яйкі і здробнены кроп. Пасаліць.

**Тварожная.** ***Спатрэбіцца:*** *тварог — 500 г, жаўток 1 яйка, 2 ст. л. цукру, 50 г разынак.*

У тварог дадаём жаўток, цукар. Усё старанна пераціраем да аднастайнай масы. Дадаём разынкі папярэдне замочаныя ў кіпені. Разынкі можна замяніць курагой ці іншымі сухафруктамі.

**Курыная.** ***Спатрэбіцца:*** *1 курыная грудка, 2 вараныя яйкі, кроп, соль, перац.*

Вараную грудку перакруціць на мясарубцы. Яйкі надзерці на буйной тарцы. Змяшаць, дадаць здробнены кроп, соль і перац.

**Грыбная.** ***Спатрэбіцца:*** *грыбы (свежыя або замарожаныя) — 500 г, 2 цыбуліны, соль, перац.* Абсмажыць асобна здробненыя грыбы, паперчыўшы і пасаліўшы іх, і цыбулю Змяшаць.

**З варанай каўбасы.** ***Спатрэбіцца:*** *200 г каўбасы, 0,5 ч. л. гарчыцы, 50 г смятаны, 100 г сыру.* Каўбасу прапусціць праз мясарубку, сыр надзерці на буйной тарцы, дадаць гарчыцу, смятану. Усё змяшаць да аднароднай масы.

**Пячоначная.** ***Спатрэбіцца:*** *500 г печані (свіной або ялавічнай), 2 цыбуліны, 1 морква, 3 яйкі, соль, перац.* Печань нарэзаць дробна і абсмажыць з цыбуляй і морквай. Яйкі надзерці на буйнай тарцы. Усё змяшаць, пасаліць і паперчыць.

**Мясная.** ***Спатрэбіцца:*** *500 г мясного фаршу, 1 цыбуліна, соль, перац.* Фарш абсмажыць з цыбуляй, пасаліць і паперчыць. Можна таксама дадаць вараны рыс.

**З сыру і вяндліны.** ***Спатрэбіцца:*** *300 г вяндліны, 150 г сыру, 2 вараныя яйкі, соль.* Вяндліну рэжам саломкай, а сыр і яйкі надзіраем на буйной тарцы. Соль на смак.

**З адварной ялавічыны.** ***Спатрэбіцца:*** *500 г ялавічыны, 1 цыбуліна, 20 г сметанковага масла, соль.* Ялавічыну адварваем 1,5 гадзіны, перакручваецца на мясарубцы. Цыбулю рэжам кубікамі і абсмажваем на масле, змешваем з мясам і солім.





**З чырвонай рыбай.** ***Спатрэбіцца:*** *мяккі плаўлены сыр і слабасалёная чырвоная рыба.* Філе рыбы дробна нарэзаць, змяшаць з плаўленым сырам. Па жаданні дадаць зеляніну.

**Яблычна-арэхавая.** ***Спатрэбіцца:*** *2 кісла-салодкія яблыкі, 1 ст. л. грэцкіх арэхаў, 1-2 ст. л. цукру, дробка карыцы.* Яблыкі надзерці на буйнай тарцы, змяшаць са здробненымі арэхамі, дадаць цукар і карыцу.

**З сыру.** ***Спатрэбіцца:*** *сыр — 250 г, 1 невялікая морква, 1 невялікі зубок часнаку, 2 ст. л смятаны або маянэзу.* Моркву надзерці на дробнай, а сыр — на буйной тарцы, змяшаць. Дадаць здробнены часнок і смятану або маянэз.

**З чарнасліву і вяршкоў.** ***Спатрэбіцца:*** *200 г чарнасліву, 1 ст. л. цукру, 50 г тлустых вяршкоў, карыца.* Чарнасліў заліць кіпенем. Праз 10 хвілін здрабніць яго, дадаць цукар, карыцу, узбітыя вяршкі. Усё старанна перамяшаць.

**Бананавая.** ***Спатрэбіцца:*** *3 бананы, 50 г тлустых вяршкоў.* Бананы і вяршкі ўзбіць на блэндары да аднастайнай масы.

**Чарнічная.** ***Спатрэбіцца:*** *200 г тварагу, 1 ст. л. цукру, 1 ст. л. смятаны, 200 г чарніц (свежых або замарожаных).* Усё здрабніць на блэндары да аднастайнай масы.

*УМЕЙ ЦАНІЦЬ ТАГО, ХТО БЕЗ ЦЯБЕ НЕ МОЖА, І НЕ ГАНІСЯ ЗА ТЫМ, ХТО ШЧАСЛІВЫ БЕЗ ЦЯБЕ (Габрыэль Гарсія Маркес).*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# ОБЪЕКТЫ ПОД ЖИЛЬЕ И ДЛЯ ВЕДЕНИЯ ЛИЧНОГО ПОДСОБНОГО ХОЗЯЙСТВА, АГРОЭКОТУРИЗМА

**Фонд «Гомельоблимущество» предлагает к продаже объекты недвижимости в различных районах Гомельской области и в г. Гомель с возможностью их использования под жилье или для ведения личного подсобного хозяйства, а также агроэкотуризма. Объекты расположены как в г. Гомель, так и в районах Гомельской области. У некоторых из них заманчивым является не только расположение (рядом реки, озера, леса), но и цена. Начальная цена продажи объектов начинается от 1 базовой величины (21 BYN), установленной в Республике Беларусь.**

## Объекты, предлагаемые к продаже сегодня

### Брагинский район



**Наименование объекта**: здание школы, детского сада (309,6 кв. м)
**Адрес**: д. Стежерное, ул. Новая, 10, 8.
**Земельные участки:** 0,1247 га; 0,2094 га.
**Цена:** 2 базовые величины.

### Буда-Кошелевский район



**Наименование объекта**: здание дома культуры (453,2 кв. м)
**Адрес**: д. Глазовка, ул. Пионерская, 5.
**Земельный участок** 0,2068 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Гомельский район



**Наименование объекта**: здание аптеки (101,8 кв. м)
**Адрес**: д. Марковичи, ул. Октябрьская, 3.
**Земельный участок** 0,0626 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### г. Гомель



**Наименование объекта**: жилой дом (150 кв. м)
**Адрес**: г. Гомель, ул. Пролетарская, 36.
**Земельный участок** 0,1031 га.
**Цена: 454 113 руб. 77 коп.**

### Добрушский район



**Наименование объекта**: здание школы-детсада (1792,3 кв. м)
**Адрес**: д. Антоновка, ул. Сосновая, 1.
**Земельный участок** 1,5461 га.
**Цена: 149 516 руб. 08 коп.**

### Ельский район



**Наименование объекта**: дом культурно-социальных услуг (85,2 кв. м)
**Адрес**: д. Шарин.
**Земельный участок** 0,0313 га.
**Цена:** 1 базовая величина.



**Наименование объекта**: здание сельского клуба (195,7 кв. м)
**Адрес**: д. Чертень.
**Земельный участок** 0,0364 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Житковичский район



**Наименование объекта**: здание сельского клуба (378 кв. м)
**Адрес**: пос. Хвоенск, ул. Солнечная, 9.
**Земельный участок** 0,1037 га.
**Цена:** 3 базовые величины.

### Жлобинский район



**Наименование объекта**: здание административное (193 кв. м)
**Адрес**: д. Верхняя Олба, ул. Рогова, 37.
**Земельный участок** 0,2829 га.
**Цена:** 2 базовые величины.



**Наименование объекта**: здание детского сада (447 кв. м)
**Адрес**: аг. Пиревичи, ул. Суворова, 29.
**Земельный участок** 0,1168 га.
**Цена: 5 273 руб. 55 коп.**

### Калинковичский район



**Наименование объекта**: здание Клинского сельского клуба (485 кв. м)
**Адрес**: д. Клинск.
**Земельный участок** 0,3841 га.
**Цена: 16 419 руб. 26 коп.**

### Кормянский район



**Наименование объекта**: здание сельского Дома культуры (47,6 кв. м)
**Адрес**: д. Задубье, ул. Партизанская, 16.
**Земельный участок** 0,0286 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Лельчицкий район



**Наименование объекта**: здание бани (210,3 кв. м)
**Адрес**: аг. Буйновичи.
**Земельный участок** 0,2444 га.
**Цена: 31 833 руб. 77 коп.**



**Наименование объекта**: здание школы (68,4 кв. м)
**Адрес**: д. Чияне, ул. Школьная, 1.
**Земельный участок** 0,3032 га.
**Цена:** 1 базовая величина.



**Наименование объекта**: здание столовой (150,8 кв. м)
**Адрес**: г.п. Лельчицы, ул. Пролетарская, 12/2.
**Земельный участок** 0,1615 га.
**Цена: 4 613 руб. 98 коп.**

### Лоевский район



**Наименование объекта**: здание дома культуры и библиотеки (213,3 кв. м)
**Адрес**: д. Димамерки, ул. Колхозная, д. 2а.
**Земельный участок** 0,1940 га.
**Цена:** 5 базовых величин.



**Наименование объекта**: здание бани (171,2 кв. м)
**Адрес**: д. Бывальки, ул. Комсомольская, 23.
**Земельный участок** 0,1049 га.
**Цена:** 2 базовые величины.



**Наименование объекта**: здание сельского клуба и библиотеки (137 кв. м)
**Адрес**: д. Деражичи, ул. Михайлова.
**Земельный участок** 0,0534 га.
**Цена:** 4 базовые величины.

### Мозырский район



**Наименование объекта**: здание сельского клуба (145 кв. м)
**Адрес**: д. Заболотье, ул. Почтовая, 1.
**Земельный участок** 0,0928 га.
**Цена: 6 014 руб. 37 коп.**



**Наименование объекта**: здание ФАПа (96,5 кв. м)
**Адрес**: д. Крушники, ул. Дзержинского, 18.
**Земельный участок** 0,1475 га.
**Цена: 6 024 руб. 24 коп.**

### Наровлянский район



**Наименование объекта**: здание клуба, (191,2 кв. м)
**Адрес**: д. Линов.
**Земельный участок** 0,1058 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Октябрьский район



**Наименование объекта**: здание сельского дома народного творчества (406,2 кв. м)
**Адрес**: аг. Волосовичи, ул. Строителей, 11.
**Земельный участок** 0,1890 га.
**Цена:** 1 базовая величина.



**Наименование объекта**: здание сельского дома народного творчества (151,8 кв. м)
**Адрес**: д. Хоромцы, ул. Потапенко, 1а.
Земельный участок 0,1934 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Петриковский район



**Наименование объекта**: здание ФАПа (145 кв. м)
**Адрес**: д. Забродье.
**Общая площадь объекта**:
**Земельный участок** 0,1582 га.
**Цена:** 6 базовых величин.

### Речицкий район



**Наименование объекта**: здание комбината бытового обслуживания (107,8 кв. м)
**Адрес**: д. Чёрное, ул. Школьная, 18.
**Земельный участок** 0,0254 га.
**Цена: 4 928 руб. 40 коп.**



**Наименование объекта**: здание ФАПа (141,3 кв. м)
**Адрес**: д. Черное.
**Земельный участок** 0,1075 га.
**Цена:** 3 базовые величины.

### Светлогорский район



**Наименование объекта**: здание детского сада (283,9 кв. м)
**Адрес**: д. Николаевка, ул. 60 лет Октября, д. 16.
**Земельный участок** 0,2042 га.
**Цена:** 1 базовая величина.

### Хойникский район



**Наименование объекта**: здание библиотеки-клуба (151,5 кв. м)
**Адрес**: д. Хвойное, 53.
**Земельный участок** 0,1261 га.
**Цена:** 1 базовая величина.



**Наименование объекта**: здание ветеринарной лечебницы (173,7 кв. м)
**Адрес**: аг. Храпков, ул. Строительная, 46.
**Земельный участок** 0,2317 га.
**Цена: 3 062 руб. 05 коп.**

## Объекты, которые планируется выставить на аукционные торги в 2017 году

### Гомельский район



**Наименование объекта**: здание бывшей библиотеки
**Адрес**: н.п. Тереничи, пер. Пионерский

### Брагинский район



**Наименование объекта**: здание бани (390 кв. м)
**Адрес**: н.п. Маложин

### Ветковский район



**Наименование объекта**: здание бани (400 кв. м)
**Адрес**: н.п. Присно, ул. Кооперативная, 6

### Ельский район



**Наименование объекта**: здание столовой (204 кв. м)
**Адрес**: н.п. Ремезы, ул. Анварова

### Жлобинский район



**Наименование объекта**: здание начальной школы
**Адрес**: н.п. Доброгоща, ул. Школьная, 4

### Калинковичский район



**Наименование объекта**: здание клуба (289 кв. м)
**Адрес**: н.п. Ужинец

**Наименование объекта**: здание бани (61,2 кв. м)
**Адрес**: н.п. Савичи, ул. Юбилейная, 3Б

### Лельчицкий район



**Наименование объекта**: здание музыкальной школы (236 кв. м)
**Адрес**: н.п. Лельчицы, ул. Набережная, 14



**Наименование объекта**: здание сельского клуба (326 кв. м)
**Адрес**: н.п. Буда-Лельчицкая, ул. Советская



**Наименование объекта**: здание начальной школы (146,38 кв. м)
**Адрес**: н.п. Дубницкое, ул. Меньшикова И.Н., 62

### Наровлянский район



**Наименование объекта**: здание бани
**Адрес**: н.п. Завойть, ул. Добровольская

### Светлогорский район



**Наименование объекта**: здание детского сада (293,4 кв. м)
**Адрес**: н.п. Ковчицы-2, ул. Партизанская

**Наименование объекта**: дом детского творчества (881,4 кв. м)
**Адрес**: н.п. Страковичи, ул. Лесная

Напоминаем, что законодательством Республики Беларусь предусмотрена возможность снижения начальной цены продажи объектов недвижимости

Подробную информацию можно получить на сайте фонда «Гомельоблимущество» **www.gomeloblim.gov.by** (раздел «Недвижимое имущество») и по адресу: **г. Гомель, пр-т Ленина, 3, каб. 412, тел.: (0232) 70-36-43, 70-38-49.**

**МЫ ВСЕГДА РАДЫ НОВЫМ ПОКУПАТЕЛЯМ!**

УНП 400243904

■ Па сутнасці

Прафесар Іван САВЕРЧАНКА:

# «ДАСЛЕДЧЫК ЛІТАРАТУРЫ ПАВІНЕН ПАСПРАБАВАЦЬ СЯБЕ Ў ТВОРЧАСЦІ»

**Вось ужо амаль год у структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі працуе ўзноўлены Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. Яго ўзначальвае прафесар, доктар філалагічных навук, член Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван САВЕРЧАНКА. Ён выдатны крытык і цікавы празаік. Спачатку нават падаецца дзіўным, як у асобе аднаго чалавека могуць спалучацца акадэмічная строгасць і дысцыплінаванасць, творчая энергія, натхнёнасць, уменне захапляцца і радавацца новым адкрыццям. Пра здабыткі і перспектывы айчыннай літаратуразнаўчай навукі, новае пакаленне аспірантаў, а таксама магчымасць сумяшчаць навуковую і творчую працу мы сёння гутарым з Іванам Саверчанкам.**


Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Іван Васільевіч, з часу аднаўлення асобнага акадэмічнага Інстытута літаратуразнаўства мінуў амаль год. Якія самыя яркія падзеі можаце адзначыць?***

— Гэты час быў вельмі насычаны ў навуковым і творчым плане. У нашай установе выйшлі цікавыя манаграфіі і калектыўныя даследаванні, тамы збораў твораў беларускіх класікаў. Праведзены знакавыя навуковыя канферэнцыі, наладжаны міжнародныя сувязі. Вельмі запомнілася сустрэча з кіраўніцтвам Пакістанскай літаратурнай акадэміі, з якой мы маем Мемарандум аб супрацоўніцтве.

***— Можа падавацца, што літаратуразнаўства — навука досыць сумная, не публічная, не яркая, не масавая. Ці сапраўды так?***

— Літаратуразнаўчая навука — старажытная навуковая дысцыпліна і адна з найважнейшых галін сучаснай гуманітарыстыкі. Яна выступае ў якасці асновы літаратурнай адукацыі і асветы грамадства. Літаратуразнаўства забяспечвае прагрэс прыгожага пісьменства, спрыяе захаванню класічных мастацкіх традыцый.

***— Якія людзі прыходзяць у інстытуцкую аспірантуру, а потым застаюцца тут працаваць?***

— Розныя паводле характару, але адданыя слову, мастацкай літаратуры. Сучасныя аспіранты больш разняволеныя, для іх амаль не існуе аўтарытэтаў, асабліва напачатку іх навуковага шляху. Вельмі добра, што практычна ўсе суіскальнікі валодаюць не толькі беларускай і рускай мовамі, але і на належным узроўні ведаюць замежныя мовы. Гэта адкрывае перад імі шырокія магчымасці ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва.

***— Літаратуразнаўства і творчая праца: ці можна сумяшчаць? Як у вас самога гэта атрымліваецца?***

— Гэтыя віды дзейнасці цалкам сумяшчальныя. Яны, нібы два крылы адной велічнай птушкі. Літаратура не можа паўнавартасна развівацца без літаратуразнаўства. У маім разуменні кожны навуковец, даследчык літаратуры абавязкова павінен паспрабаваць уласныя сілы ў літаратурнай творчасці, прымяніць у мастацкай практыцы набытыя тэарэтычныя веды. Калі і як гэта зрабіць — кожны вырашае сам. Для мяне асабістая творчая праца — лагічны працяг навуковых гісторыка-філалагічных пошукаў. Я выдаў дзве літаратурна-мастацкія кнігі, дзе змешчаны аповесці, містэрыя і некалькі эсэ. Іх галоўныя героі — найбольш значныя постаці мінулага Беларусі: полацкія князі Рагвалод і Усяслаў Чарадзей, заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага князь Міндоўг, магутны валадар Вітаўт Вялікі, беларускія магнаты — Астафей Валовіч і Леў Сапега, дзеячы культуры — Іосіф Вельямін-Руцкі і Вацлаў Ластоўскі.

Я таксама перакананы, што кожны літаратуразнавец павінен глыбока цікавіцца сацыяльнымі працэсамі і жыццём грамадства, а таксама мастацтвам, гісторыяй, філасофіяй, паліталогіяй, міжнароднымі адносінамі і іншымі сферамі. Інакш яго ацэнкі ідэйна-мастацкага зместу літаратурных твораў будуць павярхоўнымі і не заўсёды дакладнымі.

***— Некаторыя з супрацоўнікаў інстытута літаратуразнаўства з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Наколькі важнае супрацоўніцтва акадэмічнай навуковай установы і творчага саюза?***

— Супраца абавязкова мусіць быць вельмі шчыльнай. Гэта шлях да ўзаемаўзбагачэння. За апошні час супольнымі намаганнямі, пры значнай падтрымцы кіраўніцтва дзяржавы і ўрада, нам удалося стварыць эфектыўную сістэму літаратурнай асветы і адукацыі ў краіне, выпрацаваць неабходныя механізмы і стымулы для развіцця нацыянальнай літаратуры. Інстытут літаратуразнаўства і Саюз пісьменнікаў Беларусі рэалізоўць шматлікія сумесныя праекты, якія якраз і забяспечваюць устойлівасць усёй філалагічнай сферы. Апрача таго, надзвычай карысны прамы дыялог паміж пісьменнікамі і навукоўцамі, што дазваляе вырашаць многія пытанні ў рабочым парадку.

***— Ці ўваходзяць у кола навуковых інтарэсаў супрацоўнікаў Інстытута літаратуразнаўства творы сучасных беларускіх аўтараў?***

— У Інстытуце практычна ўсе цікавяцца сучасным літаратурным працэсам, знаёмяцца з найбольш цікавымі творамі паэзіі, прозы і публіцыстыкі. Нашы супрацоўнікі рэгулярна пішуць рэцэнзіі, артыкулы і агляды для літаратурных часопісаў «Полымя», «Нёман», «Белая вежа» і газеты «Літаратура і мастацтва». Творчасць сучасных пісьменнікаў — Мікалая Чаргінца, Анатоля Казлова, Георгія Марчука, Леаніда Левановіча, Генадзя Пашкова, Віктара Праўдзіна, Васіля Шырко актыўна вывучаецца і шырока прапагандуецца ў сродках масавай інфармацыі.

***— Многіх навуковых супрацоўнікаў інстытута можна назваць сапраўднымі мэтрамі айчыннай літаратурнай крытыкі. Гэта, напрыклад, Уладзімір Гніламёдаў, Міхась Тычына, Ганна Кісліцына, Яўген Гарадніцкі і іншыя. Іх меркаванне, голас уплываюць на айчынную літаратуру, да іх прыслухоўваюцца аўтары? Ну і ў цэлым, ці могуць крытыка і акадэмічнае літаратуразнаўства пэўным чынам каардынаваць літаратурны працэс?***

— Дзякуючы кіраўніцтву Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі нам удалося ўзнавіць работу акадэмічнага Інстытута літаратуразнаўства, які каардынуе навуковыя даследаванні ў рамках дзяржаўнай падпраграмы «Беларуская мова і літаратура». Пры Інстытуце стала працуе Савет па абароне дысертацый, старшынёй якога якраз з'яўляецца Уладзімір Гніламёдаў, а яго намеснікам — Міхась Тычына. Мы рыхтуем кадры вышэйшай кваліфікацыі — кандыдатаў і дактароў навук, прычым не толькі для свайго Інстытута, але і для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Такім чынам, умацоўваецца філалагічнае асяроддзе ў краіне, забяспечваецца пераемнасць і падтрымліваецца высокі ўзровень філагічнай культуры ў грамадстве. Крытыкі, якія працуюць у Інстытуце, — вельмі кваліфікаваныя эксперты. Да іх парад і пажаданняў пісьменнікі прыслухоўваюцца і ўлічваюць ва ўласнай творчасці.

**«Нам удалося стварыць эфектыўную сістэму літаратурнай асветы і адукацыі ў краіне, выпрацаваць неабходныя механізмы і стымулы для развіцця нацыянальнай літаратуры».**

***— Якія кірунікі літаратуразнаўства нам варта развіваць сёння?***

— Гісторыю і тэорыю літаратуры, кампаратывістыку і тэксталогію. Даўно планую адкрыць у Інстытуце аддзел замежнай літаратуры, каб глыбей спасцігаць здабыткі лепшых майстроў слова блізкага і далёкага замежжа, што істотна гальванізуе нацыянальны літаратурны працэс.

***— Як бачацца перспектывы супрацоўніцтва Інстытута літаратуразнаўства і Саюза пісьменнікаў?***

— У нас шмат кропак судакранання і ліній супрацоўніцтва. Асабліва плённа супольна працавалі і цяпер працуем у рэгіёнах краіны, наладжваем творчыя сустрэчы, круглыя сталы і канферэнцыі. На парадку дня Інстытута — стварэнне аддзела літаратурнай крытыкі. Яго мэта — аператыўна рэагаваць на навінкі прозы, паэзіі і драматургіі, аналізаваць дынаміку сучаснага літаратурнага працэсу, выяўляць і прапагандаваць найбольш значныя ў мастацкім плане творы прыгожага пісьменства.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

# ЛЯЛЬКІ ПРАЗ УСЁ ЖЫЦЦЁ,

## або Рыцары тэатра не старэюць душой

**У Віцебску адсвяткавалі 70-годдзе Віктара КЛІМЧУКА, нязменнага мастацкага кіраўніка Беларускага тэатра «Лялька». Віктар Клімчук без перабольшвання творца сусветнай велічыні. Ён ставіў спектаклі ў розных краінах, працаваў у журы, экспертных саветах шматлікіх міжнародных конкурсаў. У 1996 годзе стаў лаўрэатам прэміі «Сузор'е муз». Тады ж атрымаў званне «Чалавек года» ў намінацыі «Тэатральная творчасць» — за вялікі ўклад у развіццё лялечнага мастацтва. У 1998-м рэдакцыя газеты «Культура» прысвоіла яму спецыяльнае званне «Рыцар тэатра» як самаму яркаму тэатральнаму дзеячу года.**


**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ (злева) віншуе юбіляра.**

Падчас святочнага капусніка «Лялькі праз усё жыццё» ў глядзельнай зале Беларускага тэатра «Лялька» не было свабодных месцаў. Дарэчы, тут заўсёды яблыку недзе ўпасці. Заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь павіншавалі кіраўнікі мясцовай улады. Была перададзеная ганаровая грамата ад Міністэрства культуры. Замежныя калегі, прыхільнікі таленту таксама ўручылі падарункі.

— Віктар Ігнатавіч 30 гадоў таму стварыў выдатны калектыў. У тэатры шчырыя стасункі, ёсць творчая сем'і. Віцебск ужо нельга ўявіць без «Лялькі», тэатр стаў сімвалам горада. А юбіляр — «бацька» трупы і лялек. Ён — сімвал тэатра, — выказаў шчырыя словы падзякі ад імя гледачоў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Падчас ушанавання было весела. Акцёры радавалі свайго любімага кіраўніка жартамі, імправізацыямі, каламбурамі, творчымі сюрпрызамі. Дзве гадзіны прадстаўлення прайшлі на адным дыханні.

Добрым падарункам да юбілею Віктара Клімчука стала і прэзентацыя дыска «Вяселле», арганізаваная вядомым музыкантам Сяргеем Доўгушавым і казачніцай Аленай Масла. Запісы, зробленыя ў 1968—1969 гадах пісьменнікам Сяргеем Панізнікам у ваколіцах вёскі Лявонпаль (Мёрскі раён), прагучалі ў выкананні полацкага фальклорнага гурта «Варган».

Ганаровае званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь» «Лялька» атрымала ў 2000-м. У рэпертуары спектаклі не толькі для дзятвы, але і для дарослых. У скарбонцы творчых дасягненняў шматлікія Гран-пры прэстыжных міжнародных фестываляў, дыпломы, граматы, прызы.

Падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» тэатр становіцца цэнтрам унікальнага праекта «Лялечны квартал».

Рэжысёр Віктар Клімчук — даўні і надзейны сябар «Звязды». Рэдакцыя была партнёрам у арганізацыі розных конкурсаў для дзятвы, якія праводзіліся ў «Ляльцы». У прыватнасці, на лепшага анёла, «Казка для Караткевіча».

Шчыра віншуем юбіляра. Моцнага здароўя і новых шэдэўраў! Упэўненыя, што яшчэ не раз публіка і крытыкі прызнаюцца яму ў любові. Віктар Клімчук — Чарадзей, які дапамагае трапіць у казку. Гараджане і госці Віцебска дзякуючы яму ведаюць, дзе прадаюць білеты ў... дзяцінства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

■ Уражанні

# КОРАТКА, АЛЕ ГЛЫБОКА

**Давялося нядаўна прачытаць кнігу Зіновія Прыгодзіча «Родник у лесных берез», раздзел з якой «Мініяцюры» настолькі мяне ўразіў, што я, звычайная настаўніца, хачу падзяліцца гэтымі ўражаннямі з іншымі чытачамі.**

Мініяцюра па сутнасці сваёй — закончаны твор, у якім усяго ў некалькіх радках аўтар дае простор для думак чытачу: кожны ўспрымае напісанае па-свойму, у кожнага свае асацыяцыі. Прачытаўшы семдзесят пяць мініяцюр Зіновія Прыгодзіча, нібы прагортваеш кнігу ўласнага жыцця. Так могуць сказаць людзі старэйшыя, у якіх гэта жыццё ўжо за плячыма. А для маладзейшых гэта нібы падручнік жыццёвай філасофіі, якую яны толькі пачынаюць спасцігаць.

Колькі ў гэтых мініяцюрах закладзена аўтарам: погляд у будучыню, складаны недасягальны свет чалавечай душы, парадокс чалавечай прыроды, калі не можаш спазнаць усю глыбіню шчасця без барацьбы, духоўны свет бацькоў, зачараванне перамогамі — уласнымі і блізкіх людзей.

Вельмі цікава разважае аўтар аб шчасці, аб каханні, якое ў кожнага сваё, аб дрэве жыцця, аб сувязі чалавека і прыроды. А як прыгожа разважае ён аб жыцці наогул! Імчаць, спяшаюцца ў невядомую далячынь нашы дні і ночы: лёгка і радасна ў юнацтве, ганарліва і магутна ў сталым узросце, стомлена-ціха, са светлай журбой — у старасці. І ў кожным узросце людзі мараць пра лепшае.

Каханне Зіновій Прыгодзіч параўноўвае з сонцам: яго цяпло адчуваеш на адлегласці, без яго няма жыцця. А чалавек, які кахае без узаемнасці, падобны да жураўля, што выбіўся з сіл, адстаў ад чарады, застаўся адзін са сваім болем, са сваёй горкай песняй.

Мастацтва ў мініяцюрах цесна звязана з лёсам народным. Калі мастак — асоба, ён заўсёды будзе ў цэнтры жыцця.

Асабліва прачула і натхнёна аўтар піша аб прыродзе сваёй роднай зямлі. Увогуле ўсе мініяцюры ў кнізе Зіновія Прыгодзіча прасякнуты любоўю да Радзімы, роздумам і цхім зачараваннем. Каб штосьці падобнае адчуць самому, варта іх прачытаць.

**Вера КАРЦЭЛЬ**

г. Мінск.

# Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| | ЛОТ №1 |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)** по ул. Писателя Смирнова на земельном участке площадью 0,5676 га с объектами недвижимости, подлежащими сносу |
| **Функциональное назначение земельного участка** | Строительство объекта производственно-складского и торгового назначения |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **В аренду сроком 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | Объекты КУП «Брестский городской ремонтно-строительный трест» |
| Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с его расположением в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, охранной зоне линий электропередачи | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **73 770,74** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 14 750 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | 5 154,14 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **529 387,50** *(на 23.03.2016 г.)* |

**ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»**

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке градостроительного паспорта, земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта, регистрации прав, ограничений (обременений прав на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) после осуществления внесения в установленные сроки сумм платежей, но не позднее 2-х рабочих дней (управление архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома);

в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к освоению (занятию) земельного участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления.

**Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100, Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

